Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Незакарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вярочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 70 к. „ 3 „ — 2 р. — к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародніх — 20 к. мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нанпарэлі насьпрад тэксту 1 р. — к. За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. дарожэй. Зьніж тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 14 (2202) Аўторак, 17-га студзеня 1928 г

Для культурнага росту вёскі

Новы закон аб парадку самаабкладаньня вёскі павінен адыграць вялікую ролю ў культурным і гаспадарчым росьце вёскі.

Па новаму закону самаабкладаньне дапушчаецца выключна для **забясьпечаньня мясцовых культурных і гаспадарчых патрэб, маючых грамадзкае значэньне.** Такім чынам, пры правільным скарыстаньні сродкаў, сабраных па самаабкладаньню, культурны фронт у вёсцы атрымае значнае падмацаваньне.

Адсыўленьне працы сельскіх саветаў, якія з кожным годам усё больш займаюць кіруючае месца ў вясковай грамадзкасьці, дало магчымасьць усклась ці на іх і кіруючую ролю ў правядзеньні самаабкладаньня. Мэнавіта гэта набліжэньне сельсаветаў як органаў дзяржаўнай улады, да пытаньняў самаабкладаньня павінна паслужыць парукай таго, што зьбіраемыя сумы будуць як сьлед скарыстаны ў вёсцы.

Існуючай да гэтага часу практыцы, калі самаабкладаньне праводзілася бяз усякага кіраўніцтва з боку органаў улады і без арганізацыйнага кантролю з боку насельніцтва, новым законам пакладзен канец. Пытаньні самаабкладаньня па новаму закону будуць абгаварвацца на агульных сходах грамадзян на ініцыятыве і пад кіраўніцтвам сельсавету. Разьмеркаваньне паміж грамадзянамі павінна праводзіцца зноўткі сельсаветам з удзелам прадстаўнікоў камітэту сялянскай узаемадапамогі. Кантроль за скарыстаньнем сум, паступіўшых на самаабкладаньню, будзе праводзіцца рэвізійнымі камісіямі сельсавету.

Перад сельсаветамі і райвыканкомамі дэкрэтам пастаўлена новая вялікая задача: **кіраваць вясковым самаабкладаньнем так, каб кожны рубель ішоў на сапраўдныя культурныя і гаспадарчыя патрэбы, каб абмеркаванае на сходзе і ўхаванае большасьцю галасоў самаабкладаньне няўхільна праводзілася ў жыцьцё.**

Культурных патрэб у вёсцы шмат. Зразумела, нельга разьлічваць, каб самаабкладаньнем задаволіць усе патрэбы. Сельсавет, як добры гаспадар, павінен вывяліць, на якія патрэбы перш за ўсё неабходна самаабкладаньне: ці адрамантаваць мост, ці набыць радыё для хаты-чытальні, ці пабудаваць фельчарскі пункт, ці адрамантаваць школу, ці купіць пажарную машыну? Сельсавет павінен быць натхніцелем культурных пачынаньняў вёскі. Гэта яго роля займае асноўнае месца ў новым законе аб самаабкладаньні.

Другая задача сельсаветаў і райвыканкомаў—сачыць за тым, каб самаабкладаньне на сходах праводзілася з захаваньнем інтарэсаў вясковай беднаты. Вызваленьне незаможных пластоў у вёсцы ад самаабкладаньня па закону праводзіцца самымі сходамі, але ад сельсавету залежыць, папершае, **растлумачыць сходу тыя артыкулы закону, якія датычацца самаабкладаньня беднаты,** а, падругое, сельсавету дасьць права **замяніць самаабкладаньне ў грашовай форме натуральным узносам ці ўдзелам асабістай працай.**

Новы закон уцягвае ў культурнае і гаспадарчае будаўніцтва ўсё працоўнае насельніцтва вёскі, і, што асабліва важна, ён падводзіць матар'яльны фундамант пад працу сельсавету, бо сумы, сабраныя на самаабкладаньню, якія знаходзяцца ў яго распараджэньні, зьяўляюцца дадаткам да бюджэту, а для бяз**бюджэтных сельсаветаў—пакладуць першы камень самастойнай бюджэтнай гаспадаркі.**

Новы закон аб самаабкладаньні павінен стаць штурхачом да культурнага і гаспадарчага скарыстаньня грошай у вёсцы.

Куды карысьней укласьці рубель: на школу, адрамантаваньне шляхоў, на пакупку пажарнай машыны, на арганізаваньне дзіцячых ясьляў і пабудову больніцы, чым перагнаўшы сотні і тысячы тон хлеба на самагон, праніць сотні і тысячы рублёў, а гэтым самым інтарэсы гаспадарча-культурнага разьвіцьця.

Зараз пасьля правядзеньня новага закону аб самаабкладаньні кожны селянін—удзельнік самаабкладаньня, павінен узрокам пільнага гаспадара сачыць за тым, каб кожная лішняя капейка ішла на карысьць гаспадарцы і культуры, а не патанула-б у самагонным моры.

Калі па самаабкладаньню вёска можа даць на ўзмацненьне культуры па ўсяму Саюзу да 100 млн. руб., дык спыненьне зьнішчэньня хлеба на самагон зможа з'эканоміць у вёсцы новыя вялікія сумы.

За самаабкладаньне на справу культуры!

Супроць самагоннага зьнішчэньня хлеба!

Вось дзе вёзунгі, вакол якіх павінна аб'яднацца ўся савецкая працоўная вёска.

Падрыўная праца трацкістаў проці Камінтэрну.

МАСКВА, 15-1. 15-га студзеня ў «Праўдзе» зьмешчаны 2 дакументы. Гэтыя дакументы ўяўляюць сабою дыректыўныя лісты трацкісцкага цэнтру, перасланыя заграніччным прыхільнікам Троцкага і кампаніі. Лісты выкрываюць паводзіны трацкістаў пасьля XV зьезду і даюць поўны малюнак, як трацкісцкія лідэры спрабуюць перанесьці цэнтр цяжкасьці сваёй працы ў кола барацьбы з Камінтэрнам, развальваць яго рэвалюцыйныя рады, падрываць аўтарытэт СССР і УсеКП у колах заходня-эўрапейскіх рабочых. Лісты зьмяшчаюць доўгі рад непасрэдных практычных зазначэньняў, як і якім параядам апазіцыя павінна дзейнічаць.

«Правда» ў артыкуле «Пасобнікі Шэйдэмана за працаю» наконт агалошаных дакументаў піша: «Самы першы вывад, які можна зрабіць з агалошаных дакументаў, той, што нелегальная праца праводзіцца па ўсіх напрамках пасупроць розным клятвам і заверэньням апазіцыі. Ні на адзін дзень пасьля зьезду былыя апазіцыянэры трацкісты ня спынялі сваёй бруднай антыпартыйнай і антыкамінтэрнаўскай працы. Адбываўся і адбываецца выраб розных „дакументаў", іх друкаваньне, распаўсюджаньне і рассылка самымі цёмнымі сродкамі, у тым ліку пры пасрэдніцтве буржуазных агентаў. «Супярэчнасьці досыць глыбокія, каб апраўдваць існаваньне левае фракцыі»,—даводзяць лісты. Выпушчаецца «самастойная штодзённая газэта», якая нясе атручаны наклёп проці СССР—„орган фракцыі". У процівагу плянформе Камуністычнага Інтэрнацыяналу мяркуецца выставіць «плянформу міжнароднае камуністычнае левае». Адбываюцца падрыхтоўкі да кангрэсаў Прафінтэрну і Камінтэрну».

Абодвы дакументы яскрава сьведчаць аб глыбокім разбродзе ў колах былушае апазіцыі. Адыход Каменева і Зіноўева ад апазіцыі трацкісты спаткалі абураючым лямантам. Трацкісты ганьбяць Каменева і Зіноўева за падначаленьне бальшавіцкаму зьезду, як здрадніка. Дакументы выразна кажуць, што адзіная групоўка, на якую трацкісты „цьвёрда" спадзяюцца, гэта махровая правая апартуністычная група Койяр Лёрыё і інш. Трацкісты спадзяюцца «прыцягнуць» таксама рэнэгата Росмэра, даўно выключанага з радоў міжнароднага камунізму. Нават Суварын, апартуніст, ад якога за вярсту нясе цьвілым сацыял-дэмакратызмам, друкаваны орган якога нельга чытаць без агіднасьці, і той «прыцягваецца», і той зьяўляецца «таленавітым гісторыкам», «рэвалюцыянэрам».

Гэты саюз з правымі, гэты абоз палітычнага бруду на чале з Троцкім, ганарыста імянуецца «міжнароднай камуністычнай левай».

Лісты-дырэктывы заслугоўваюць, каб іх прачытаць уважліва абдумваючы кожны абзац. У іх асабліва выразна можна ўбачыць сапраўдны сацыял-дэмакратычны твар трацкізму. У іх контррэвалюцыйныя антыпралетарскія тэндэнцыі трацкізму выступаюць у аголенай форме. Нікога, зразумела, ня могуць падмануць два-тры словы проці сацыял-дэмакратыі. Павадыры сацыял-дэмакратыі будуць фыркаць на гэтыя словы, таксама, як фыркаюць Гільфэрдынгі і Вэльсы на «забавы» сваіх «левых».

«З капітулянтамі трэба рваць пяшчадна»,—гэтыя словы ў лістах накіраваны проці тых, хто капітулюе перад бальшавіцкай партыяй. Але гэтыя словы зьяўляюцца зусім правільнымі ў адносінах да тых, хто капітулюе на справе перад сусьветнай сацыял-дэмакратыяй, хто выступае пасобнікам Шэйдэмана, хто далучаецца да хору брахуноў проці дыктатуры пралетарыяту, да злоснага скрыгатаньня мяшчан на цяжкасьці сацыялістычнага будаўніцтва, хто марыць аб «крутым паціску буржуазіі». З такімі здрадзікамі трэба рваць пяшчадна, такіх папоў трэба гнаць прэч з пралетарскае сям'і».

Падрабязнасьці нападу на Брусэльскую выстаўку СССР.

МАСКВА. Як паведамілі супрацоўніку ТАСС у аддзеле выставак ВОКС'а, арганізатары савецкае выстаўкі ў Брусэлі падалі зыск да ўлады на ўвесь кошт набітых і зьнішчаных экспанатаў. Выстаўка складалася з 9 аддзелаў. Нападчыкі разграмілі першы аддзел, які складалі экспанаты, ілюстраваўшыя адміністрацыйны і нацыянальны падзел СССР, культурнае разьвіцьцё народнасьцяў Саюзу і інш. Разгромлен таксама і другі аддзел—«Народная асьвета і культурнае будаўніцтва ў СССР». На шчасьце ў гэтай справе не пацярпелі тэатральныя макеты і фарфура. Аб лёсе каштоўнае калекцыі саматужных вырабаў пакуль-што яшчэ нічога невядома. Як відаць, у гэтым аддзеле загінулі мастацкія плякаты, малюючыя вашыя дасягненьні ў галіне школьнага будаўніцтва, барацьбы з няпісьменнасьцю, клюбнага будаўніцтва і г. д. Асабліваю лютасьць нападчыкі выявілі ў 9-м аддзеле—«Чырвонае арміі»,—багата прадстаўленым экспанатамі, малюючымі культурна-асьветную працу Чырвонае арміі. 3-ці аддзел—«Аховы здароўя і сацыяльнага забясьпечаньня» таксама зруйнаваны.

Аддзелы «рабочы быт і прафсаюзы», «сельская гаспадарка», «прамысловае будаўніцтва і электрыфікацыя СССР», «транспарт, сувязь і авіяцыя», «гандаль і фінансавае жыцьцё СССР» не пацярпелі.

Адпор ангельскаму наступу на Пэрсію.

Пэрсідзкі адказ на ангельскую ноту?

ТЭГЕРАН, 15-1. «Сэтарэ Іран» друкуе такое паведамленьне: «Воддуг падасланых нам вестак, пэрсідзкі ўрад паслаў такі адказ на ангельскую ноту: 1) у сучасны момант упарадкаваць пытаньне аб пэрсідзкіх даўгох немагчыма для пэрсідзкага ўраду; 2) пэрсідзкі ўрад ня можа дазволіць ангельскаму ўраду правесьці паветраны шлях над паўднёвымі тэрыторыямі Пэрсіі; 3) пэрсідзкі ўрад здолее прызнаць Ірак толькі на вядомых і зусім пэўных умовах; 4) пытаньне аб знароце ранейшага шэйха ў Хузістан і аб аднаўленьні яго масмасных правоў, а таксама пытаньне аб волі падарожжаў пэрсідзкіх грамадзян з Пэрсіі ў Ірак зьяўляюцца ўнутранымі справамі Пэрсіі, і ангельская нота ў гэтай частцы разглядаецца пэрсідзкім урадам, як умешваньне Англіі ва ўнутраныя справы Пэрсіі».

Гэтае паведамленьне афіцыйна пакуль што не пацьверджана.

УВАГА: у пачатку лістапада 1927 г. ангельскі ўрад перадаў пэрсідзкаму ўраду ноту, у якой патрабаваў: 1) правесьці праз мужыцкі згоду аб кансалідацыі пэрсідзкага доўгу Англіі; 2) хавоўліць Англіі правесьці брытанска - індэрскі паветраны шлях праз порты Пэрсідзкае затокі; 3) прызнаць Ірак і скасаваць забарону падарожжа з Пэрсіі ў Ірак; 4) хавоўліць вярнуцца ранейшаму шэйху ў Хузістан і адначіць яго масмасныя правы.

Індыя абудзілася.

РУХ ЗА БАЙКОТ АНГЕЛЬСКІХ ТАВАРАЎ.

КАБУЛ, 14-1. Індыйскі нацыянальны друк паведамляе, што пасьпадаючы ў сучасны момант у Калькуце кангрэс рэспубліканцаў ухваліў рэзалюцыю аб поўным байкоце намісіі Саймона (па праверцы практыкі ажыцьцяўленьня парляманцкіх рэформ). У дзень прыезду камісіі кангрэс прапануе абвясьціць нацыянальную жалобу і заклікаць наладжваць дэманстрацыі ва ўсіх гарадох і мясцовасьцях, якія перамога намісія.

У канцы кангрэс патрабуе байкоту ангельскіх тавараў. Усеіндыйская мусульманская ліга ў Калькуце і індыйская гандлёва-прамысловая палата таксама выказаліся ў карысьць байкоту.

ПОЎДЗЕНЬ КІТАЮ Ў АГНІ ПАЎСТАНЬНЯЎ.

ШАНХАЙ, 16-1. Кітайскі друк зьмяшчае шмат паведамленьняў аб камуністычных паўстаньнях у цэнтральным і паўднёвым Кітаі. Шанхайская газэта „Шун Бао" адзначае, што рабочы і сялянскі рух у правінцыях Цьзянсу, Фуцьзян і Хубэй пашыраецца. У Сючжоу (на поўдні правінцыі Цьзянсу), піша газэта, быў учынен замах на жыцьцё паліцэйскага інспэктара. У іншых раёнах правінцыі Цьзянсу ліквідавана адбываюцца камуністычныя паўстаньні. У Чанчжоу (на паўднёвым усходзе правінцыі Фуцьзян) камуністы разьбілі 4 роты правінцыйнага войска. Камітэт Гаміндану ў Чанчжоу уцёк у Амой.

У правінцыі Хубэй камуністычныя атрады пад камандаваньнем Лё-Шы-Шаю захапілі некалькі вёсак у Сногаза (за 50 кілёмэтраў на паўночны захад ад Ханькоу).

Ганконская газэта „Індэстрыэль эн Комэрш Дэйлі" паведамляе, што ў правінцыі Гуандунь каму істы і сяляне падрыхтоўваліся да захопу Сватоу.

Паўстаньні сялян.

ШАНХАЙ, 14-1. З Ганконгу перадаюць, што ва Ўханскім раёне ўсюды апэруюць паўстанцкія атрады сялян, кіруемыя камуністамі. Войска Ен-Сі-Шана нанесла мукдэнцам паражэньне ў 150 кілёмэтрах на паўночны ўсход ад Тайюан-Фу.

Паглыбленьне развалу Гаміндану.

ТОКІЁ, 14-1. Водлуг паведамленьняў з Шанхаю, гуансійская групоўка на чале з Бай-Цзун-Чы згодна супрацоўнічаць з Чан-Кай-Шы на наступных умовах: 1) Чан-Кай-Шы прызнае правінцыю Гуандунь, Гуансі, Хубэй і Хунань сфэрамі ўплыву гуансійскае групоўкі і 2) ня ўмешваецца ў ваенныя справы гэтае „сфэры", якія будуць цалком накіраваны на дапамогу паўночнай экспэдыцыі.

Прадстаўнікі крайняе правае цішанскае групоўкі выяўляюць адзнакі незадаволеньня палітыкаю Чан-Кай-Шы. Кітайскія газэты паведамляюць, што 4 ПЛЕНУМ ГАМІНДАНУ АДКЛАДЗЕНЫ НА НЕВЯДОМЫ ЧАС.

ФЫНЬ РАТУЕ ГАМІНДАН.

ПЕКІН, 16-1. З Шанхаю паведамляецца, што Фынь-Юй-Сян агаласіў вялікую адозву, у якой ізноў падкрэсьлівае патрэбу захаваць Гаміндан, «як неадлучную частку нацыянальнага руху».

«Усе пакуты, што перажывае Кітай,—зазначана ў адозьве,—ідуць ад імпэрыялістычнае палітыкі ў адносінах да Кітаю. Чужаземцы, якія спачуваюць Кітаю, будуць мець дапамогу ад народнае арміі. Але з агрэсыўнымі імпэрыялістамі мы будзем змагацца самым рашучым чынам».

Нарэшце Фынь-Юй-Сян заяўляе, што «Кітай павінен неадкладна распачаць фактычны перагляд няроўных угавораў.

Водлуг прыватных вестак, надасланых з Шанхаю, навакол Фынь-Юй-Сяна групуюцца радыкальныя сілы Гаміндану».

Японская пазыка Чжан-Цзо-Ліну.

ТОКІЁ, 14-1. З Пекіну паведамляюць, што Чжан-Цзо-Лін зьвярнуўся да японскіх колаў у Манчжурыі з просьбаю аб дачы яму пазыкі. Прэзыдэнт Паўднёва-Манчжурскае чыгункі заявіў, што ён згодзен выдаць Чжан-Цзо-Ліну 5 мілёнаў іен у якасьці авансу на пабудову Гірын-Хайлунскае чыгункі.

У Саюзе ССР.

На фронце хлебазагатовак.

САМА ВЁСКА ЗМАГАЕЦЦА З СПЭКУЛЯНТАМІ.

ПЯЦІГОРСК, 14-1. Хлебаробы пачынаюць разумець шкоду дзейнасьці прыватніка на хлебазагатоўчым рынку. На агульным сходзе зямельнага таварыства ў Мінэральных Водах хлебаробы заявілі аб сваёй гатоўнасьці ўсімі мэтадамі дапамагаць барацьбе са спэкуляцыяй хлебам. У сяле Салдацка-Аляксандраўскім агульны сход бяднякоў і сярэдняяў аднязгодна пастанавіў вясьці барацьбу з машочнікамі.

АРЫШТ ШКОДНІКАЎ.

ІВАНАВА-ВАЗЬНЯСЕНСК, 14-1. ДПУ арыштавала шмат прыватных гандляроў у Іванава-Вазьнясенску, Кінішме і інш. гарадох за зрыў загатовак аўса ўнутры губерні і продаж хлебапрадуктаў з перавышэньнем на 80-100 проц. проці вызначаных цэн.

ПАРТЫЙЦЫ ПЕРШЫМІ

КАЗАНЬ, 14-1. Партыйцы-актывісты Тулячынскага крэдытнага таварыства першымі здалі загатоўчым органам 200 пудоў хлеба.

ЯК ВЫПЛАЧЫВАЕЦЦА С.-Г. ПАДАТАК.

Вылазка кулакоў.

ТОМСК, 14-1. На вёсцы Альмосапежанцы кулакі з помсты за выяўленьне аб'ектаў абкладаньня спалілі некалькі стагоў сена ў братоў Хруль. Кулакі таксама дамагліся звальненьня нібы за нядбайнасьць сакратара савету, які дамагаўся поўнага выяўленьня схаванае пашы. Вядзецца тэрміновае расьсьледаваньне.

Выгавар за слабую працу.

КАСТРАМА, 14-1. Загадчыкам бурскага і салігаліцкага павятовых фінадзелаў зроблен выгавар за слабую працу па зборы сельска-гаспадарчага падатку.

Да судовае адказнасьці.

КАЛУГА, 13-1. Губстрах прыцягнуў да судовае адказнасьці шэраг агентаў і волыкаркомаў за нядбайнасьць у справе збору страхавых выплат.

Польшча напярэдадні выбараў.

Урадавы сьпісак у Вільні.

«Роботнік» паведамляе, што першае мейца на „ўрадавым" сьпіску ў Вільні займае ген. Жэлігоўскі, а другое—майёр Касьнякоўскі.

Міністры ў погоні за мандатамі.

Усе міністры ўраду Пілсудзкага, як паведамляе „Газэта Поранна" (№ 10), выставяць свае кандыдатуры на выбарах. Ня будуць кандыдаваць толькі сам Пілсудзкі і міністр замежных спраў Залескі. Між іншым, пагромшчык Грамады—міністр Мейштовіч будзе кандыдаваць у Віленшчыне.

Беларускія эсэры і выбары ў сойм.

„Кур. Вільн." паведамляе, што віленскія беларускія эсэры ня выставяць на выбарах у сойм свайго ўласнага сьпіску.

«Краёвае Аб'яднаньне».

У Віленскай акрузе «Краёвае Аб'яднаньне» выстаўляе наступныя кандыдатуры: адвакат Абрамовіч, адвакат Рачкевіч, Умястоўскі, Вэндзягольскі і інш.

* * *

Гэтае аб'яднаньне, як паведамляе „Дз. Вільн.", прыступіла да арганізацыі на паветах сваіх выбарчых камітэтаў. Роўным чынам аб'яднаньне будзе выдаваць сваю газэту пад назваю „Аб'яднаньне".

Паўлюкевіч праводзіць сябе ў сойм.

На першым мейцы паўлюкевічаўскага выбарнага сьпіску будзе стаяць кандыдатура самога «д-ра» Паўлюкевіча.

І цыганы ідуць на выбары.

Да сакратарыяту віцэ-міністра п. Цара зьявіўся цыган Яп Міхалян, просячы аб інфармацыях на выбарных справах. Міхалян заяўляе, што цыганы, якіх ёсьць Польшчы некалькі дзесяткаў тысяч, маюць намер выставіць уласны сьпісак.

«Сель-Роб» працуе.

Найбольш энэргічную перадвыбарную акцыю на Вільні разьвівае „Сель-Роб"—украінскі сялянскі работніцкі саюз. Галоўным кіраўніком выбарнай акцыі „Сель-Робу" зьяўляецца б. пасол Казінкі Сяргей.

Сьмяюцца з прыяцеля...

Кумпанійка: Яромічь, Рагуля, Назарэўскі заўсёды разам хаўрусавалі, адзін другога падтрымліваючы Сэнатар Назарэўскі, які не належаў і не належыць ні да якой партыі, лічыў патрэбным падтрымаць сельсаюзьніцкі зьезд і заявіў на ім, што ён ужо пераканаўся, што імецна сельсаюз Яромічa і Рагулі зьяўляецца адзінай „истинно-бедорусской" партыяй. А цяпер «Сял. Ніва» зьдзекуецца над ім і шапракае ў тым, што ён перакідаецца ад Паўлюкевіча да розных іншых арганізацый.

Сорам, паночкі, сьмяцца над сваім прыяцелем.

Падрыўная праца трацкістаў проці Камінтэрну.

МАСКВА, 15-1. 15-га студзеня ў «Праўдзе» зьмешчаны 2 дакументы. Гэтыя дакументы ўяўляюць сабою дыректыўныя лісты трацкісцкага цэнтру, перасланыя заграніччным прыхільнікам Троцкага і кампаніі. Лісты выкрываюць паводзіны трацкістаў пасьля XV зьезду і даюць поўны малюнак, як трацкісцкія лідэры спрабуюць перанесьці цэнтр цяжкасьці сваёй працы ў кола барацьбы з Камінтэрнам, развальваць яго рэвалюцыйныя рады, падрываць аўтарытэт СССР і УсеКП у колах заходня-эўрапейскіх рабочых. Лісты зьмяшчаюць доўгі рад непасрэдных практычных зазначэньняў, як і якім параядам апазіцыя павінна дзейнічаць.

«Правда» ў артыкуле «Пасобнікі Шэйдэмана за працаю» наконт агалошаных дакументаў піша: «Самы першы вывад, які можна зрабіць з агалошаных дакументаў, той, што нелегальная праца праводзіцца па ўсіх напрамках пасупроць розным клятвам і заверэньням апазіцыі. Ні на адзін дзень пасьля зьезду былыя апазіцыянэры трацкісты ня спынялі сваёй бруднай антыпартыйнай і антыкамінтэрнаўскай працы. Адбываўся і адбываецца выраб розных „дакументаў", іх друкаваньне, распаўсюджаньне і рассылка самымі цёмнымі сродкамі, у тым ліку пры пасрэдніцтве буржуазных агентаў. «Супярэчнасьці досыць глыбокія, каб апраўдваць існаваньне левае фракцыі»,—даводзяць лісты. Выпушчаецца «самастойная штодзённая газэта», якая нясе атручаны наклёп проці СССР—„орган фракцыі". У процівагу плянформе Камуністычнага Інтэрнацыяналу мяркуецца выставіць «плянформу міжнароднае камуністычнае левае». Адбываюцца падрыхтоўкі да кангрэсаў Прафінтэрну і Камінтэрну».

Абодвы дакументы яскрава сьведчаць аб глыбокім разбродзе ў колах былушае апазіцыі. Адыход Каменева і Зіноўева ад апазіцыі трацкісты спаткалі абураючым лямантам. Трацкісты ганьбяць Каменева і Зіноўева за падначаленьне бальшавіцкаму зьезду, як здрадніка. Дакументы выразна кажуць, што адзіная групоўка, на якую трацкісты „цьвёрда" спадзяюцца, гэта махровая правая апартуністычная група Койяр Лёрыё і інш. Трацкісты спадзяюцца «прыцягнуць» таксама рэнэгата Росмэра, даўно выключанага з радоў міжнароднага камунізму. Нават Суварын, апартуніст, ад якога за вярсту нясе цьвілым сацыял-дэмакратызмам, друкаваны орган якога нельга чытаць без агіднасьці, і той «прыцягваецца», і той зьяўляецца «таленавітым гісторыкам», «рэвалюцыянэрам».

Гэты саюз з правымі, гэты абоз палітычнага бруду на чале з Троцкім, ганарыста імянуецца «міжнароднай камуністычнай левай».

Лісты-дырэктывы заслугоўваюць, каб іх прачытаць уважліва абдумваючы кожны абзац. У іх асабліва выразна можна ўбачыць сапраўдны сацыял-дэмакратычны твар трацкізму. У іх контррэвалюцыйныя антыпралетарскія тэндэнцыі трацкізму выступаюць у аголенай форме. Нікога, зразумела, ня могуць падмануць два-тры словы проці сацыял-дэмакратыі. Павадыры сацыял-дэмакратыі будуць фыркаць на гэтыя словы, таксама, як фыркаюць Гільфэрдынгі і Вэльсы на «забавы» сваіх «левых».

«З капітулянтамі трэба рваць пяшчадна»,—гэтыя словы ў лістах накіраваны проці тых, хто капітулюе перад бальшавіцкай партыяй. Але гэтыя словы зьяўляюцца зусім правільнымі ў адносінах да тых, хто капітулюе на справе перад сусьветнай сацыял-дэмакратыяй, хто выступае пасобнікам Шэйдэмана, хто далучаецца да хору брахуноў проці дыктатуры пралетарыяту, да злоснага скрыгатаньня мяшчан на цяжкасьці сацыялістычнага будаўніцтва, хто марыць аб «крутым паціску буржуазіі». З такімі здрадзікамі трэба рваць пяшчадна, такіх папоў трэба гнаць прэч з пралетарскае сям'і».

Камуністычная арганізацыя ў Коўні.

АРЫШТАВАНА 19 ЧАЛАВЕК.

КОЎНЯ, 15-1. Літоўскія газэты паведамляюць, што палітычная паліцыя нібыта выкрыла ў Коўні камуністычную арганізацыю, „у ліку сяброў якое знаходзіцца шмат ніжэйшых служачых мясцовых устаноў". Газэты заяўляюць, што па гэтай справе пакуль-што арыштавана 19 чалавек, «у якіх знайдзена абвінавачваючая іх перапіска».

Водлуг слоў газэт, сярод арыштаваных—бухгальтар яўрэйскага банку Ўлахін, памоцнік правізара Буракас, Станконіус і 2 жанчыны Шунаўскайтэс і Табараўскіенэ.

ПРАЭКТ ЗЬМЕНЫ ЛІТОЎСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ.

«Берлінэр Тагэблят» паведамляе, што літоўскі ўрад мае намер у бліжэйшым часе правесьці пры помачы дэкрэту праэкт зьмены канстытуцыі.

ПРАЭКТ ЗЬНІШЧЭНЬНЯ ЧЫГ.

Газэта «Латвіс» паведамляе, што літоўскі ўрад мае намер зьняць колія Кашадар-рэйкі з былой Лібава-Роменскай чыгункі на працягу 25 клм. і перанесьці іх на іншае месца. Газэта пратэстуе проці гэтага, зазначаючы, што гаспадарчыя інтарэсы Лібаўскага порту залежны ў значнай ступені ад надыцьця нармальнага руху па лініі Лібава-Рамны.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ „ПАЛІТЫКА" АНГЕЛЬСКІХ РЭФАРМІСТАЎ.

ЛЁНДАН, 11-1. З Іёганэсбургу паведамляецца, што паўднёва-афрыканскі саюз прамысловых рабочых і гандлёвых служачых (які налічвае блізка 100 тысяч сяброў, пераважна мурынаў) агаласіў пратэст проці недапушчэньня яго ў склад паўднёва-афрыканскага кангрэсу прафсаюзаў, на чале якога стаяць прафсаюзы рабочых эўрапейскіх нацыянальнасьцяў.

«Мы,—зазначана ў пратэсьце,—не дапусьцім, каб кангрэс абыходзіўся з намі, як з жабракамі. У якасьці арганізаваных рабочых сябры нашага саюзу маюць права кіраваць дзейнасьцю ўсіх прафсаветаў, дзе яны складаюць большасьць».

„АМЭРЫКАНІЗАЦЫЯ" ГАЛЯНДЗКАГА РЭФАРМІСЦК. ПРАФРУХУ.

БЭРЛІН, 13-1. З Амстэрдаму паведамляюць, што саюз прадпрыёмнаў Галяндыі прапанаваў галяндзкаму аб'яднаньню прафсаюзаў заснаваць больш шчыльнае супрацоўніцтва і запрасіў старшыню і сэкратара прафсаюзнага аб'яднаньня ўзяць удзел у нарадзе супольна з прадстаўнікамі каталіцкіх і хрыстыянска-нацыянальных прафсаюзаў. Аб'яднаньне прафсаюзаў настаяліва ўхваліць гэтую прапанову.

БЭРЛІНСКІЯ РАБОЧЫЯ ЗАПРАШАЮЦЬ ПУЦІЛАЎЦАЎ У НЯМЕЧЧЫНУ

БЭРЛІН, 11-1. У зьвязку з пастановаю пуцілаўскіх рабочых паслаць у Нямеччыну другую рабочую дэлегацыю, берлінскі камітэт адзінства прыслаў пуцілаўскім рабочым заяву, падпісаную таксама і сацыял-дэмакратамі—удзельнікамі першага, другога і трэцяга падарожжа нямецкіх рабочых у СССР. У заяве гаворыцца, што прыхільнікі адзінства ў Нямеччыне зробяць усё, што ў іх сілах, каб дамагчыся дазволу на выезд у Нямеччыну савецкае рабочае дэлегацыі, больш шматлікае, чымся ў першы раз.

Праэкты новага Лёкарно.

БЭРЛІН, 11-1. Водлуг паведамленьняў з Жэнэвы, Швэдыя і Нарвэгія падалі ў сэкратарыят Лігі Нацый на разгляд камісіі па бэзапаснасьці праэкты ўсеагульнага ўгавору аб арбітражы і прымірыцельнай прафэктуры. У галоўным праэкты аднолькавыя і пабудаваны на прынцыпах Лёкарно.

Праэкт пабудовы чыгункі праз Сахару.

ПАРЫЖ, 10-1. Францускі ўрад зацьвердзіў палажэньне аб бюро па распрацоўцы праэкту пабудовы транс-сахарскае чыгункі. Як мяркуюць, праца бюро будзе закончана да красавіка 1929 г. Кошт падрыхтоўчае працы вылічан у суме каля 12 мілёнаў франкаў, частку якіх дае францускі ўрад, а частку—Алжыр, Туніс, Марока і некаторыя францускія чыгуначныя кампаніі.

Японскі эканаміст аб СССР.

ТОКІЁ, 12-1. Вядомы японскі эканаміст Кухаро, наведаўшы СССР, у гутарцы з прадстаўнікамі друку заявіў: «Палітычнае становішча СССР цалкам трывалае».

Кухаро падкрэсьліў неабходнасьць больш шырокага супрацоўніцтва з СССР у будучым праз разьмяшчэньне японскіх капіталаў у Азіяцкай Расеі, „дзе Японія павінна падзяліць прыбытак з СССР замест таго, каб атрымліваць усё для сябе».

Японскі парлямант напярэдадні роспуску.

ТОКІЁ, 11-1. Водлуг вестак „Токіё Асахі", урад схіляецца да думкі распусьціць парлямант пасьля зачытаньня ўрадавае дэкларацыі ў адзнаку адмаўленьня надыходзячае сэсіі.

Урад абвясьціў аб звальненьні 4-х губернатараў і аб пераводзе 23-х губэрскіх чыноўнікаў. Па агульнай думцы, гэтыя захады сьведчаць аб падрыхтоўцы ўраду да новых выбараў.

НОВЫ ЛАТВІЙСКІ ЎРАД.

Пасьля большмесячнага ўрадавага крызісу ў Латвіі, урэшце ўтворан новы латвійскі ўрад з партый правіцы і цэнтру. На чале ўраду стаў прадстаўнік дэмакратычнага цэнтру Юрашэўскіс. Да новай каліцыі далучыліся амаль ня ўсе мяшчанскія партыі, а таксама немцы, два палякі, частка расейцаў і яўрэяў.

Ад'езд у Парыж тав. Даўгалеўскага.

МАСКВА. Выехаў у Парыж прадстаўнік СССР у Францыі Даўгалеўскі.

Швэдзкія дрэваапрацоўчнікі пад пагрозаю лёкауту.

СТАКГОЛЬМ, 12-1. Уласьнікі швэдзкіх лесапільных заводаў з 23-га студзеня абвяшчаюць лёкаут на ўсіх сваіх прадпрыёмствах, калі да гэтага часу ня будзе ўпарадкаван канфлікт між рабочымі і прамыслоўцамі прадпрыёмствам па выпрацоўцы драўнінае масы для папяровае прамысловасьці.

Выклік Капабланкі Алёхіну.

НЬЮ-ЁРК, 15-1. Капабланка зьвярнуўся да старшыні нацыянальнае шахматнае федэрацыі Злучаных Штатаў Амэрыкі з просьбаю дапамагчы яму арганізаваць матч з чэмпіёнам сьвету Алёхіным. Капабланка прапануе наладзіць матч у Амэрыцы.

Вестні адусюль.

ПЕРАМОГА КАНДЫДАТА РАБОЧАЕ ПАРТЫІ.

ЛЁНДАН, 10-1. На дадатковых выбарах у Портгентоне кандыдат рабочае партыі атрымаў 15.156 галасоў, кансэрватар—14.554 і лібэрал Марган—9.575.

АНГЕЛЬСКАЯ ПАЗЫКА ГРЭЦЫІ.

ЛЁНДАН, 11-1. Грэцкі міністр фінансаў Бафандарыс, які зараз знаходзіцца ў Лёндане, падпісаў згоду з кансорціумам ангельскіх банкаў аб наданьні Грэцыі пазыкі ў разьмеры 6 з палов. мілёнаў фунтаў стэрлінгаў.

**ФРАНЦУСКАЕ СУДНАБУДАЎНІЦТВА

АД'ЕЗД СТАРШЫНІ СНК БССР т. ГАЛАДЗЕДА Ў МАСКВУ.

Учора старшыня Савету Народных Камісараў БССР тав. Галадзед выехаў у Маскву дзеля ўдзелу ў аб'яднаным пасяджэньні Савету Народных Камісараў і Савету Працы і Абароны Саюзу ССР па разгляду дзяржаўнага бюджэту.

Да гадавіны крывавае расправы.

Роўна год таму назад—у ноч з 14 на 15 студзеня 1926 г.—урад Пілсудзкага арабіў вельмі рызыкоўны для сябе крок: паліцейскім спосабам распраніўся з Беларускай Сялянскай Работніцкай Грамадой.

У гэтую памятную ноч польская паліцыя ператрасла ўсю Заходнюю Беларусь і арыштавала сотні прыгнечаных панскім уціскам нашых заходніх братоў. Сярод арыштованых у гэтую ноч былі тры беларускія паслы сойму: Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі і Валошын, а таксама пасол незалежнай сялянскай партыі Галавач. Чацьверты беларускі пасол Мятла быў арыштован трохі пазьней. Пяты беларускі пасол-грамадавец, які потым перайшоў у лягер Яраміча і К°, чамусьці зусім ня быў арыштаван. Апрача паслоў, якія былі арыштованы без дазволу сойму, а значыць з нарушэньнем асноўных законаў канстытуцыі, было арыштавана шмат выдатных беларускіх дзеячоў і цэлыя сотні беларускіх работнікаў і сялян.

Пакуль адважыцца на такі рашучы наступ проці нацыянальна-радыкальнага беларускага руху, які згуртаваўся навакол легальнай, дапушчанай польскай уладай партыі БСРГ, польскі фашысм доўга да яго рыхтаваўся.

Арышты паасобных дзеячоў і цэлых груп іх, разгоны зьездаў мясцовых арганізацый БСРГ, урэшце разгон і пабоішча на зьезьдзе БСРГ у Стара-Бярозаве, Бельскага пав., дзе былі пабітыя да крыві два беларускія паслы-Мятла і Валошын і сто ўдзельнікаў зьезду,—усё гэта прарочыла ўжо генэральны бой.

Польская праса ўсіх кірункаў, а перважна віленская абшарніцкая, ужо даўно вяла падгатоўку разгрому Грамады.

Можна думаць, што разгром Грамады быў задумаў даўно, можа быць яшчэ тады, калі маёвы ўрад Пілсудзкага вельмі ахвотна рабіў прыгожыя вочы ў беларускі бок, абяцаючы задаволіць «справядлівыя» вымаганьні беларускага эдраджэнчага руху.

Па прыпятаму ў панскай Польшчы кітаду далей ішло і пры маёвым урадзе вядомае «rozproszkowanie» (распыленьне) сіл нацыянальных меншасьцяў, асабліва-ж—беларускіх, як слабейшых за іншыя нацменшасьці Польшчы. Адным—прадажніцкім сілам—сталі даваць яшчэ большыя грашовыя дапамогі, другім,—якія хоць і паверылі, ды ня ўсім, абяцанкам, дазволілі быць «апаніцыяй яго вялікасьці», а трэцім, якія ні на хвіліну не сумляваліся ў хлусьні, сталі пагражаць і застрашаць.

«Новая эра» хутка выявілася і ня толькі ў арыштах. Як вядома, урад Пілсудзкага не дапусьціў прыезду ў Менск делегатаў ад заходніх беларусоў на акадэмічную канфэрэнцыю, на якую зьехаліся прадстаўнікі амаль ня з усіх суседніх дзяржаў, апрача Польшчы, адкуль прыехаў з Варшавы толькі адзін праф. Голомбэк.

Гэты знамянацельны факт недапушчэньня на навуковую канфэрэнцыю беларускіх навуковых працаўнікоў Польшчы яскрава сьведчыў аб дзікасьці, надзвычайнай некультурнасьці, грубасьці, а разам з тым і заячай нужлівасьці польскай палітыкі да беларусоў.

Паўурадавая польская газэта „Курэр Віленьскі" (№ 272, 24-XI-1927) так тлумачыла гэты факт:

«Як відаць, польская ўлада грунтавалася на тым становішчы, што на зьезд у Менск ня можа быць дадзен дазвол прадстаўніком тых палітычных арганізацый, ці іх прыхільнікам, якія вядуць варожую польскай дзяржаве працу, выяўляючы яўныя сымпатыі да Савецк й Беларусі. Да гэтай арганізацыі аднесена Грамада і яе прыхільнікі. Таму і забаронен выезд у Менск тым, хто з Грамадой ці з яе ідэалёгіяй мае хоць якую-небудзь сувязь»...

«Баяліся,—прадаўжае аўтар,—што паездка ў Менск, «маючых іншую думку» дасьць магчымасьць зрабіць антыпольскую параду з мэтай устанаўленьня адзінай антыпольскай працы і адзінства дзеяньняў. Але для гэтага зусім непатрэбны навуковыя зьезды»...

...«Калі будзе неабходна, дык гэтыя спатканьні могуць заўсёды адбыцца, калі ня ў Менску, дык у Рызе ці Данцыгу»...

... «Забарона выезду з Польшчы на навуковы зьезд зьяўляецца лепшым козырам для антыпольскай прапаганды».

Як бачым, нават паўурадавая газэта пачала «за здароўе», а скончыла «за ўпакой», г. ё. растлумачыла факт так, што ўрэшце не апраўдала па сутнасьці паступку свайго ўраду.

Мы тут знарок прывялі некаторыя ўспаміны аб акадэмічнай канфэрэнцыі, бо факт недапушчэньня на яе беларускіх прадстаўнікоў з Зах. Беларусі ўжо тады яскрава сьведчыў аб сапраўдных намерах польскага ўраду. Тады ўжо пасьпеў і быў плянава падрыхтаваны разгром. Але, зразумела, хто-ж мог быць прарокам наступных падзей, якія вызліліся ў самыя дзікія формы.

Трэба цяпер сьцьвярдзіць, што гэтая плянавая работа на разгрому Грамады была абдумана даўно і яе правялі, як па нотах, паны маёвыя гэроі. І трэба было дзьявальскай хітрасьці і ненавісьці да работніцка-сялянскага беларускага руху, каб зрабіць так, як было зроблена. І трэба мець якоесь-та каменае сэрца, якісь-та інквізітарскі розум, каб справу Грамады, а фактычна справу беларускага народу ў Польшчы з такой паступовасьцю, з такім настойлівым тэмпэрамантам, з такою жорсткасьцю сыстэматычна вясьці і думаць, што так і трэба.

Найлепшыя людзі Заходняй Беларусі, якія шчыра працавалі на карысьць свайго народу, якія не маглі не працаваць на яго карысьць, бо аж сэрца абліваецца крывёю, калі пагляджэш, нават ня ўдумваючыся глыбака ў шматвяковае гора прыгнечанага народу, прыгнечанага панэмі, якія цяпер ізноў успомнілі свае старыя павадкі і зноў робяць спробу закаваць у кайданы нашых братоў.

Хутка будзе наледжана судовая расправа над арыштаванымі. Іх прывядуць на гэтую інквізітарскую каэдзіну і ў іх асобах пастараюцца расьпяць ідэю вольнасьці беларускага народу. Паны будуць лезьці са скуры, каб даказаць, што абвінавачаныя зьяўляюцца здраднікамі польскай дзяржавы, г. ё. той панскай нволі, у якую закавалі беларускі народ тварцы сучаснай польскай дзяржаўнасьці. Гэта расправа не прынясе польскім панам шчасьця. Гэта толькі паслужыць яшчэ адным магутным этапам на шляху вызваленьня Заходняй Беларусі з-над сваіх прыгнятацеляў.

М. Кахановіч.

Хлеб—не спэкулянту, а каапэрацыі.

За продаж пшаніцы гандлярам магілеўскія каапэратары аддадзены пад суд.

У хлебазагатоўках заўважваецца пералом. Узмоцнім тэмп загатоўкі сыравіны.

(Гутарка з Нам. НК Гандлю тав. Брыськіным).

Я толькі што вярнуўся з падарожжа ў Магілеўшчыну і Аршаншчыну, мэтай якога было ўзмацненьне загатовак хлеба і сыравіны.

Неабходна сказаць, што па хлебазагатоўках амаль што ўсюды назіраюцца такія зьявішчы, што гэтаму вельмі важнаму пытаньню мясцовыя каапэрацыйныя арганізацыі (спажывецкія і сельска-гаспадарчыя) не зьвяртаюць належнае ўвагі. Да прыкладу, Мецьціслаўскае спажывецкае таварыства, якое ў першым квартале хлебазагатоўкі вялося хоць і ў нязначных разьмерах, у другім жа квартале зусім выключыла з свайго апэрацыйнага пляну хлебазагатоўчыя апэрацыі. Тлумачыцца такое ненармальнае зьявішча тым, што каапэрацыя цікавілася выключна завозам хлеба з па-за межаў БССР, ігнаруючы зусім загатоўчую працу. Касьцюковіцкае сельска-гаспадарчае таварыства (Магілеўшчына), замест загатовак хлеба, атрымлівала авансы ў насельніцтва на завоз апошняга і гэты аванс трымае ўжо тры месяцы, абяцаючы сялянам даць хлеба.

Разам з тым неабходна адзначыць, што пізоўка ад сваіх каапэрацыйных цэнтраў ня мела дырэктыў аб загатоўцы хлеба, дзякуючы чаму цэлы шэраг мясцовых каапэрацыйных арганізацый зусім ня меў ніякіх плянаў па загатоўцы.

Трэба адзначыць, што па ўнутраным хлебным рынку папуе прыватнік. Маюцца таксама выпадкі, калі прыватнік для атрыманьня тых хлебапрадуктаў, якія ён ня мае магчымасьці загатовіць на мясцовым рынку, скарыстоўвае каапэрацыю. **Да прыкладу, з аднаго з магазынаў Магілеўскага ЦРК 12-га студзеня прыватнаму гандляру было адпушчана 110 п. пшанічнае мукі і гэта ў той час, калі пайшчыкам пшанічная мука даецца толькі па 2 кілё на кніжку. Цікава адзначыць, што гэтая мука правозілася прыватнікам сярод белага дню на цэрабкопаўскім транспарце. Увесь штат магазыну арыштаваны і справа знаходзіцца ў пракуратуры. Маецца на ўвазе наладзіць паказальны працэс.**

Такі-ж выпадак здарыўся і ў Аршанскім ЦРК, толькі з той розьніцаю, што там прыватніку была адпушчана меншая колькасьць—каля 30 пуд.

Вара-цэвіцкае спажывецкае таварыства (Аршаншчына) прадала аднаму хутаранину 70 пуд. жыта, а сам старшыня таварыства з атрыманага жыта ўзяў сабе цэлых 150 пудоў.

Як ленінградцы становяцца пайшчыкамі Аршанскага ЦРК.

Прыяжджае ў гор. Воршу з Ленінграду прыватны гандляр і чамусьці зараз атрымоўвае з ЦРК членскую кніжку. Гэтаму **«сталічнаму пайшчыку»** магазын ЦРК дае перавагу і адпушчае значную колькасьць мануфактуры, а той накіроўвае яе ў Ленінград. Справа гэта знаходзіцца ў стадыі дасьледваньня. Вінаватыя будуць належна пакараны.

Наступіў пералом у загатоўцы хлеба.

Дзякуючы цэламу шэрагу ўжытых мерапрыёмстваў у сучасны момант на мясцох ужо назіраецца некаторы пералом у хлебазагатоўках, павялічваецца паступленьне хлеба. Каапэрацыйныя працаўнікі, якія выявілі недапушчальную нядбайнасьць у такім важным пытаньні, як хлебазагатоўкі, зараз ужываюць усе захады да скарыстаньня сэзону для выкананьня заданьняў па хлебазагатоўках.

Характэрна адзначыць, што Амсьціслаўскае каапэрацыйныя працаўнікі заявілі аб тым, што яны поўнасьцю задаволяць патрэбы сваім хлебам, а, між тым, раней жылі выключна за кошт завознага хлеба. **Як станоўчае зьявішча належыць адзначыць тое, што ўсюды хлебныя цэны ў каапэрацыі трымаюцца на адным узроўні, а ў некаторых пунктах маецца нават некаторае зьніжэньне продажных цэн.**

Кепска справа і з загатоўкаю сыравіны.

У той час, калі ў адносінах хлеба яшчэ частку цяжкасьцяў можна адносьці да рахунку аб'ектыўных прычын, дык у адносінах загатоўкі сыравіны, асабліва экспортнай, асноўнымі прычынамі невыкананьня загатоўчага пляну на першы квартал зьяўляецца цэлы шэраг арганізацыйных дэфэктаў.

Цэлы шэраг каапэрацыйных арганізацый зусім ня мелі заданьняў ад сваіх каапэрацыйных цэнтраў і загатоўкі вяліся чыста выпадкова. Мерапрыёмствы па абмежаваньні дзейнасьці прыватнага рынку, асабліва па скуранай сыравіне, вельмі слаба праводзіліся ў жыцьцё. У той час, калі такая скурсыравіна, як каніна, вельмі патрэбная для нашай прамысловасьці, дзяржаўнымі каапэрацыйнымі арганізацыямі амаль не загатаўлялася, толькі ў аднаго прыватніка ў Дуброўне (Аршаншчына) выкрыта значная колькасьць гэтае сыравіны—некалькі сотняў штук. **Цікава адзначыць, што ў гэтага прыватніка знойдзена столькі буйных скур, колькі не загатавана ўсімі арганізацыямі па БССР. Гэтаму-ж прыватніку Маскоўскі Інвалідны Каапэратыў накіроўвае для перапрацоўкі 600 буйных скур, нібы няма такіх майстэрняў у Маскве.**

Часта экспортная сыравіна прадаецца небеларускім і выпадковым арганізацыям. Мы маем такія выпадкі, калі нізоўка зварочвалася да свайго акруговага каапэрацыйнага цэнтру, а той адмаўляў у прыёме загатаванага. **Амсьціслаўскае сельска-гаспадарчае таварыства зварочвалася ў Аршанскі акрсельсаюз, каб той забраў у іх экспортныя грыбы, а той адмовіўся ад пакупкі, і грыбы былі прададзены ленінградзкім арганізацыям.**

Неабходна адзначыць, што на мясцох у галіне загатовак сыравіны таксама наступіў пералом у лепшы бок.

УЗМАЦНІМ ЗАГАТОЎКІ СЫРАВІНЫ

ПЛЯН ЗАГАТОВАК НЯ ВЫКАНАН.

ВОРША, 16-I. Як хлебафуражныя загатоўкі, так і загатоўкі экспортнай сыравіны па акрузе ў значнай сваёй частцы ня выкананы. Напрыклад, хлебапрадукт на 1-е студзеня выканаў толькі 32 проц. заданьня, Дняпрасаюз выканаў загатоўкі па хлебафуражу толькі на 25 проц., Сельсаюз—38 проц.; слабае выкананьне загатовак і па буйнай скураной сыравіне, усяго 27,8 проц. заданьня. Недастаткова разгорнута праца па загатоўцы другарадных відаў экспортных тавараў (лекавыя травы, грыбы, яйкі, рызьзё і інш.).

ФОНД ПРЭМІРАВАНЬНЯ ПА ЗАГАТОЎКАХ.

БАБРУЙСК, 16-I. У акруговым інспэктарыяце гандлю распрацован шэраг мерапрыёмстваў па ўзмацненьню хлебазагатовак, а таксама загатовак сыравіны. Складзена спэцыяльны фонд у 30.000 руб. для прэміраваньня спажывецкіх таварыстваў, якія добра выканаюць працу па загатоўках.

ХЛЕБАЗАГАТОЎКІ ВЫКАНАНЫ НА 5-6 ПРОЦ.

Віцебск, 16-I. Інспэктарыят гандлю па акрузе падвёў вынікі загатоўчай кампаніі па ўсіх відах хлебафуражу і прамысловае сыравіны. Загатоўлена лёну-валакна 63.000 пуд. ці 80 проц. квартальнага заданьня, льнянога семя—53 проц.; буйнае скураное сыравіны загатоўлена 10.000 штук ці 80 проц., дробнае скураное сыравіны—20.000 шт., ці 113 проц.; мяса з намечаных 37.000 пуд. загатоўлена 19.000 пуд., ці каля 50 проц.; шчаціны загатоўлена 341 пуд., ці 164 проц., конскага волосу—134 пуд. ці 78 проц., пушніны загатоўлена на 34 000 руб., ці 95 проц., рызьзя загатоўлена 8.000 пуд., ці 80 проц.

Хлебафуражны плян выканан за першы квартал 1927-28 г. усяго на 5-6 проц.

Гэтыя лічбы кажуць аб тым, што тэмп працы па загатоўках усіх відаў сыравіны—слабы, асабліва ў адносінах да льнянога семя, мяса і рызьзя, а на хлебафуражу праца бадай не пачыналася.

„Маленькія" недарэчнасьці ў загатоўках.

Усім нам добра вядома, што пашырэньне экспорту для Савецкага Саюзу мае надзвычайна вялікае значэньне.

Вось чаму в цэнтру дасылаюцца ў акругі дырэктывы і загады, каб нашыя візавыя арганізацыі ўзмацнілі працу па загатоўцы экспортнай сыравіны.

Але... прыходзіць, скажам, такая паперка з дырэктывамі з Віцебскі акрсельсаюз, адначыне яна крыху ў рэгістратуры, а праз некаторы час нападае да чалавека, які ўжо чым мае...

— Пішуць... ды актывы, значыцца,—разважае пра сябе чын, калупаючы ў носе.— Ага, значыцца дырэктывы аб пашырэньні экспорту, ну, дык гэта „да ведама, справа № 97".

Ці ня гэткія рэзалюцыі клаліся ў Віцебскім акрсельсаюзе на распраджэньнях цэнтральных органаў, бо дагэтуль візавая сетка сельска-гаспадарчай каапэрацыі нічога ня ведала пра неабходнасьць загатовак другарадных экспортных сыравіны, а таму нічога і не рабіла ў гэтай галіне...

— Ну, Нічыпар, здаецца, мы з табой заданьне па загатоўцы ільнянага валакна выканаем поўнасьцю...

— Ды яшчэ як, нават з перавышэньнем пляну!—адказаў Нічыпар.

Гэтая гутарка ішла паміж візавымі працаўнікамі Белдзяржгандлю і сельска-гаспадарчай каапэрацыі, якія ў Люзьне і Колышках, Віцебскай акругі, мелі невялічкія загатоўчыя пункты.

А сяляне ўсё весьлі і весьлі сваю прадукцыю; нашым загатоўцам гэтак ня было дзе і хаваць яе.

— Братка, Нічыпар! Ды ў нас ужо 6 вагонаў валакна—увесь хлеў ім забілі.

Ужо пераваліла за 9 вагонаў, прыяцелі нават начэй ня сьпяць, бо хлявы драўняныя і, чаго добрага, усё дабро згарэць можа, а з Віцебску—ні слуху, ні духу.

Вось запасы валакна ўжо пераваліл за 12 вагонаў. Тут, на шчасьце нашых працаўнікаў, на месца прыехаў прадстаўнік Цар. Кам. Гандлю... Відаць, каго-небудзь „пахваляць" належна.

А як вы думаеце, таварышы віцебчане?..

Першы ўсебеларускі зьезд сялян-літоўцаў.

Нядаўна закончыўся першы зьезд сялян-літоўцаў, якія жывуць на тэрыторыі Савецкай Беларусі.

Гэты зьезд зьяўляецца адным з шэрагаў зьездаў нацыянальных меншасьцяй БССР, якія склікаліся і будуць склікацца з мэтаю больш дакладнага выяўленьня патрэб гэтых нацыянальных меншасьцяй і мерапрыёмстваў, для больш пасьпяховага эканамічнага і культурнага разьвіцьця гэтых нацыянальных меншасьцяў, з мэтаю больш шырокага ўцягненьня іх у агульнае савецкае будаўніцтва.

Каля паўсотні год таму назад сяляне-літоўцы, якіх гнала нядоля, пакідалі Літву, шукаючы працы, шукаючы больш даступных кавалкаў зямлі, шукаючы крыніц для пражыцьця. Частка гэтых літоўскіх эмігрантаў асядала ў Беларусі. Літоўскія паселішчы ўтваралісь ў самых далёкіх глухіх лясістых мясцовасьцях Беларусі. Для выкарчоўкі лесу і мала-мальскага абзавядзеньня гаспадаркаю літоўскія сяляне традыцыі шмат працы і напружаньня. Сяляне-літоўцы, так як і беларускае сялянства, пры царызьме знаходзіліся пад падвойным прыгнечаньнем: эканамічным і нацыянальным. Кастрычнікавая рэвалюцыя прынесла волю ўсім прыгнечаным нацыянальнасьцям і дала літоўскаму насельніцтву поўную магчымасьць і дапамогу ў галіне эканамічнага і культурнага разьвіцьця, дала магчымасьць навучаць сваіх дзяцей на роднай літоўскай мове. Пры гэтым трэба зазначыць, што панаваньне царызму пакінула свой глыбокі злыбедны след як на літоўскім насельніцтве, так і на яго ўзаемаадносінах з вакольным беларускім сялянствам.

Хаця сяляне-літоўцы ў вядзеньні сельскае гаспадаркі не адставалі ад сялян беларусаў, латышоў, палякаў і інш., але вякамі ўвабраная ў сябе нацыянальная адчужанасьць часткова ізалявала іх ад рэвалюцыйнага руху, ад жыцьця сялян-беларусаў. Нагляда́ўся невыстарчальны ўдзел сялян - літоўцаў у грамадзкай работе савецкага будаўніцтва. Літоўская ёска заставалася жыць сваім замкнёным жыцьцём. Беднота была мала актыўна. Між беднатой і серадняком ня было моцнага саюзу. Сярод літоўскага насельніцтва знаходзілі сабе яшчэ шырокае поле дзейнасьці клерыкальныя элемэнты.

Правільнае правадзеньне нацыянальнай палітыкі камуністычнай партыяй і савецкай уладаю ў справе эканамічнага і культурнага ўздыму ўсіх нацменшасьцяй і іх згуртаваньне ў агульнай рабоце савецкага будаўніцтва дало вялікія станоўчыя вынікі сярод літоўцаў. Першы ўсебеларускі зьезд сялян-літоўцаў зьяўляецца вялікім крокам наперад па шляху шырокага залучэньня шырокіх мас літоўскага насельніцтва ў агульную работу па савецкаму будаўніцтву. Шмат делегатаў-літоўцаў прыбыло на зьезд з пісьмовымі паказамі, у якіх выкладаліся іх патрэбы, іх пляны па далейшаму разьвіцьцю сельскае гаспадаркі і ўздыму культурнага ўзроўню адсталага насельніцтва.

Делегаты зьезду выявілі вялікую актыўнасьць; з усіх делегатаў выказалася больш 70 проц.

Указаньні тав. Васілевіча ў сваім дакладзе, што зьезд павінен вызначыць далейшыя шляхі палепшаньня гаспадаркі і культурнага абслугоўваньня літоўскіх працоўных мас, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі, былі спатканы зьездам з вялікім энтузіязмам і можна быць упэўненымі, што яны будуць правадзіцца ў жыцьцё.

Сяляне ў перапынках работы зьезду, агледзіўшы музэі, будуючыяся дамы, фабрыкі і заводы, гаварылі: «Дык вось, куды савецкая ўлада выдаткоўвае грошы, гэта вельмі добра. А мы ўсё думалі і разважалі, куды гэта ідуць сабраныя з нас грошы. Цяпер будзем ведаць». «Прыеду да дому і зараз жа займуся арганізацыяй калектыву».

Многія сяляне-літоўцы ўжо ўсьвядомілі сабе неабходнасьць калектыўнага землякарыстаньня. Што іх да гэтай пары адпуджвае ад арганізацыі калектываў, гэта небясьпека таго, што «адзін будзе працаваць, а другі будзе ўвілівацъ ад працы». Але гэта боязьнь з разьвіцьцём культурна-палітычнаасьветнай работы паступова зьнішчаецца. На гэтых пытаньнях культурнай работы больш за ўсё і спыніліся делегаты - сяляне. «У нас яшчэ мала школ, мы ня ўсе ўмеем пісаць, мы няпісьменныя, ня ўмеем культурна весьці сваю гаспадарку; у нас яшчэ не хапае настаўнікаў, няма выстарчальнай колькасьці хатнікаў, у нас яшчэ ня ўсюды арганізаваны чырвоны куток» і г.д. казалі на зьезьдзе сяляне-літоўцы.

Недахоп у культурных сілах дае сябе адчуваць. Але агульнымі натугамі гэты недахоп будзе зьнішчацца.

Па ўсіх гэтых пытаньнях зьезд вызначыў канкрэтныя мерапрыёмствы. Значэньне зьезду заключаецца таксама і ў тым, што на ім была прадстаўлена ўся працоўная сіла літоўскай вёскі: беднота, серадняк, жанчыны (12 чалавек жанчын), інтэлігенцыя ў асобе настаўнікаў, работнікаў друку і г. д.

Усебеларускі зьезд сялян-літоўцаў глыбока прапрацаваў і правільна вырашыў усе пастаўленыя перад ім пытаньні.

Хоць многім делегатам першы раз на сваім жыцьці даводзілася выступаць з трыбуны, але яны адчувалі сабе, як у сваёй сям'і і кожны делегат імкнуўся выступаючы абмаляваць зьезду ўсё тое становішча, якое маецца на мясцох, і шчыра расказаць аб усіх маючыхся недахопах.

— Нас вельмі радуе,—казалі делегаты,—тое, што разам з намі прадстаўнікі вышэйшых органаў партыі і савецкай улады абгаварваюць усе нашы балючыя пытаньні.

Зьезд літоўцаў-сялян у поўным складзе вітаў 2-ю Сэсію ЦВК БССР УШ скліканьня, якая адбывалася ў Менску адначасна са зьездам сялян-літоўцаў.

Прадстаўнік літоўскага сялянства—делегат зьезду ў прывітальнай прамове на Сэсіі зазначыў:

«Пралетарская рэвалюцыя ў Расіі ня ніку вызваліла і беларусаў і літоўцаў, якія жывуць на Беларусі. Супольнымі намаганьнямі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, мы ўжо залячылі застаўшыяся пасьля вайны раны. Мы прыступілі да пабудовы новага сацыялістычнага жыцьця. Шмат у нас ёсьць яшчэ недахопаў, шмат нязробленай працы. Але тое, што мы пры савецкай, рабоча-сялянскай уладзе з году ў год узьнімаем гаспадарку, паляпшаем наш дабрабыт, зьяўляецца лепшай парукай далейшага нашага разьвіцьця і росквіту. Мы ведаем, што савецкая ўлада сваёй правільнай нацыянальнай палітыкай дапамагае нам у пабудове школ, хатчытальняў, у разьвіцьці сацыялістычнай культуры на нашай роднай мове. Мы абяцаем прыкладаць усе сілы, каб будаваньне сацыялізму пад кіраўніцтвам і ў саюзе з рабочай клясаю далей разгортваць, нашыраць, узмацняць супольнымі і дружнымі намаганьнямі ўсіх народаў Савецкай краіны».

Работа зьезду пакінула на ўсіх яго ўдзельніках глыбокае ўражаньне. Разьяжджаючыся, делегаты запэўнівалі, што яны прыложаць усе свае намаганьні для ўздыму на мясцох актыўнасьці літоўскіх працоўных мас ва ўсёй грамадзкай рабоце для прыцягненьня іх да працы на ўзмацненьню савецкага будаўніцтва.

Работа гэтага зьезду сялян-літоўцаў ня толькі дала ўказаньні літоўскаму сялянству Беларусі, як трэба агульнымі намаганьнямі будаваць дабрабыт працоўных мас, яна дала рабочым і сялянам Захаду яшчэ адзін доказ таго, як камуністычная партыя і савецкая ўлада на справе правільна ажыцьцяўляюць нацыянальную палітыку.

А. ХАЦКЕВІЧ.

На эканамічныя тэмы.

Сыравіна.

I.

Ад правільнага разьвязаньня праблемы сыравіны залежыць лёс разьвіцьця нашае прамысловасьці, нашыя экспортна-імпортныя пляны, нармалізацыя нашага ўнутранага рынку—адным словам праблема сыравіны, гэта ледзь не асноўны стрыжань, на якім прыходзіцца будаваць нашыя гаспадарчыя кан'юктуры.

Ва ўмовах нашае канцэнтраванае гаспадаркі праблема сыравіны ў асобных гаспадарчых раёнах і, нават, рэспубліках кожа разглядацца толькі ў суровай увязцы з ацэнкаю агульнасаюзнага стану сыравіннае гаспадаркі. Вось чаму мы ў пачатку спробуем характарызаваць праблему ў цэлым, у намеры вярнуцца да пастаноўкі пытаньня аб сыравіне ў беларускім абхваце бліжэйшымі днямі.

Чым-жа характарызуецца сёньня сыравінная гаспадарка нашага Саюзу? Аб гэтым цікавыя лічбовыя даныя мы знаходзім у вялікім артыкуле т. В. Рышара (гл. «Торг.-Пром. Газета» ад 30-XII 1927 г.). Воллуг гэтых лічбаў, асноўная характэрнасьць стану нашае сыравіннае гаспадаркі ў тым, што адваўленьне валавых збораў сыравінных культур адстае ад адваўленьня засеўнае плошчы. Ураджайнасьць тэхнічных культур зараз ніжэйшая, чымся да вайны; адваўленьне і разьвіцьцё тэхнічных культур адбываецца на экстэнсыўнай асновае, галоўным парадкам, за кошт пашырэньня засеўных абшараў.

Засеўныя абшары ў мінулае лета склалі: пад бавоўнаю—115 проц. даваенных абшараў, пад канаплямі—130 проц., пад сланэчнікам—240 пр. Значна перавышан даваенны ўзровень плошчы і пад іншымі тэхнічнымі культурамі, за выключэньнем лёну, засеўная плошча якога складала 95 проц. даваеннае. У той-жа час разьмеры валавых зборaў такія: бавоўны—82 пр. даваеннае, канопляў—117 проц., сланэчніку—265 проц., лёну—67 проц. і цукровых буракоў—90 проц. Валавыя зборы жывёльнае сыравіны таксама адноўлены ніпоўна і адстаюць ад дасягнутага ўзроўню адваўленьня гурту буйнае і дробнае рагатае жывёлы.

Другая характэрнасьць: у параўнаньні з даваенным часам востра ўзрасло скарыстаньне сыравіны ў хатняй гаспадарцы сялянства, асабліва шкуры, воўны, алейнага семя, канопляў—наогул, тых галін сыравіны, якімі бедна нашая гаспадарка.

Хоць агульная колькасьць усіх галін сыравіны, якая застаецца зараз унутры краю, значна павялічылася ў параўнаньні з даваенным часам, аднак таварная маса большасьці галін сыравіны адносна (а па некаторых галінах сыравіны і абсалютна) зьменшылася, з прычыны ўзросшага асяданьня сыравіны на мясцох.

ВАЛАВЫ ВЫХАД СЫРАВІНЫ І АСЯДАНЬНЕ НА МЯСЦОХ.

(Водлуг балянсаў ВСНГ СССР, без паправак на недавучот статку і валавае прадукцыі жывёльнае сыравіны, зробленых экспэртнаю радаю ЦСУ).

	Застаецца ўнутры СССР (за выключэньнем экспорту) у тысячах тон.		У тым ліку асядае ў уласных гаспадарках уласьнікаў сыравіны, у тыс. тон.	
	1913 г.	1926-27 г.	1913 г.	1926-27 г.
Лён-валакно	177	231	80,5	141
Канопля	352	478	250	405
Алейная сыравіна	1.900	2.600	393	605
Воўна грубая і паўгрубая	123	132	47,5	90
Шкуры буйныя (у мін. штук)	9,2	10,3	0,15	0,8
Шкуры дробныя (у мін. штук.)	33	46,5	5	13,8

Валавы збор бавоўны і цукровых буракоў, як і да вайны, поўнасьцю застаецца ўнутры краю. Агульная маса рэшты тэхнічных культур, якая скарыстоўваецца ўнутры краю (уключаючы і асяданьне на мясцох), узрасла: тытун—на 36 проц., махорка—60 проц., шоўкавыя коканы—на 3 пр. проці даваеннага часу. Пры гэтым разьмеры экспорту большасьці экспортных галін сыравіны ў 1927-28 г. значна меншыя за даваенныя; так, вываз лёну складае 10 проц. даваеннага, вываз канопляў—12 проц. Увоз сыравіны з заграніцы перавышае даваенны па бавоўне, воўне і буйных шкурах. Калі, аднак, узяць пад увагу даваенны ўвоз з заграніцы гатовых вырабаў з воўны і шкуры ў цяперашнія раёны СССР і перавесьці гэтыя вырабы на сыравіну, дык мы атрымаем некаторае зьменшэньне ўвозу з заграніцы ў параўнаньні з даваенным часам.

Вось усе пералічаныя момэнты і зьяўляюцца асноўнымі цяжкасьцямі сыравіннага становішча СССР. Ня кажучы ўжо аб слабым разьвіцьці сыравіннага экспорту, так неабходнага для забясьпечаньня ўвозу з заграніцы тэхнічнага абсталяваньня і машын для прамысловасьці,—наш Саюз ня мае зараз патрэбнае колькасьці сыравіны для поўнае загрузкі дзяржаўных прамысловых прадпрыёмстваў. Недахоп сыравіны зьяўляецца адным з лімітаў разьвіцьця савецкае прамысловасьці. У 1927-28 г. нашая прамысловасьць будзе загружана: у ненькаапрацоўваючай галіне на 50 проц., у алейнаробчай—на 75-80 проц., у цукровай, шкуранай, ваўнянай, ільнянай і бавоўнянай галінах—на 90 прыблізна процантаў.

Недахват сыравіны прымушае з асабліваю асьцярогаю ілянаваць далейшае разьвіцьцё нашае лёгкае індустрыі, перапрацоўваючае с.-г. сыравіну. На некалькі гадоў наперад ілянны разьвіцьця прамысловасьці і капітальнага будаўніцтва лёгкае індустрыі разрахаваны з некаторым адставаньнем ад усё ўзрастаючага попыту на рэчы шырокага спажываньня.

II.

Адною з галоўных прычын, якія выклікаюць дэфіцыт сыравіны, зьяўляецца на думку В. Рышара ня толькі слабы збор і нізкая таварнасьць яе, але і перапрацоўка вялікае колькасьці сыравіны самат жыцьмі і дробнымі прадпрыёмствамі для ўнутрывяскова-ага спаросту (у тым ліку і сыравіны заказчыкаў). Такія прадпрыёмствы нерацыянальна абсталяваны, трацяць большую, чым пры рацыянальных спосабах вытворчасьці, колькасьць сыравіны на адзінку вырабу і кепска скарыстоўваюць адвіды. Перапрацоўка сыравіны гэтымі прадпрыёмствамі дае страту вядомае часткі карыснае масы сыравіны, а нізкая якасьць вырабаў і вялікі процант браку на іх вядуць да далейшых страт матар'яльных каштоўнасьцяў.

У яшчэ большай меры маюць месца гэтыя зьявішчы пры хатняй перапрацоўцы сыравіны сельскімі гаспадарам.

Калі-б удалося адхіліць або паслабіць місавае непрадукцыйнае спажываньне сыравіны на мясцох, дык можна было-б пры той-жа валавай прадукцыі сыравіны значна павялічыць карысную масу яе пры скарыстаньні ў рацыянальна абсталяваных прадпрыёмствах і тым самым больш поўна пакрыць попыт рынку па вырабы з с. г. сыравіны, як у сэнсе колькасьці, так і якасьці іх. Гэтая задача на думку В. Рышара, павінна быць выканана дзяржаваю поруч з ажыцьцяўленьнем мерапрыёмстваў у справе арганічнае перабудовы сыравіннае гаспадаркі СССР.

Аднак В. Рышар з жалем прызнае што дзеля барацьбы з непрадукцыйным скарыстаньнем сыравіны робіцца зараз надта мала. За апошнія гады наглядалася нават узрастаючае асяданьне на мясцох грубае воўны, дробных шкур і канопляў. Вельмі востра ўзрасло асяданьне лёну ў 1926-27 г. у параўнаньні з 1925-26 г. (да 49 проц. усяе валавае прадукцыі проці 36 проц. у 1925-26 г.). Як правіла, узрастае асяданьне тых галін сыравіны, з якіх вырабляюцца тавары, якімі рынак слаба забясьпечан, і, наадварот, зьмяншаецца асяданьне т. зв. дастатковых галін сыравіны (тытун, махорка).

III.

В. Рышар бачыць прычыны гэтага асяданьня недастатковых галін сыравіны па месцы перш за ўсё ў агульных эканамічных фактарах—недастачы прамтавараў, уздыме заможнасьці вёскі, лішках грашовых рэсурсаў на вёсцы г. д. З другога боку, ён знаходзіць, што **гэтае асяданьне ўзмацняецца дзякуючы некаторым памылкам у справе рэгуляваньня загатовак сыравіны, у справе плянаваньня дзейнасьці прамысловых прадпрыёмстваў і разьмеркаваньня па райёнах недастатковых тавараў.** Такія памылкі здараюцца з-за непагоджанасьці ў працы мясцовых і цэнтральных органаў па рэгуляваньні рынку і працы прамысловасьці.

У першай палове загатоўчага сэзону 1926-27 г., напрыклад, мясцовыя органы, рэгулюючыя гандаль, амаль усюды забаранілі дзяржаўным загатоўцам скарыстоўваць разьязную агентуру пры загатоўках сыравіны. Гэта было выклікана імкненьнем перадаць на апэратыўнаму апарату галоўную масу загатовак на візавым вясковым рынку. Гэта, у аснове сваёй правільнае, мера рыемства, праведзенае ў безагаворачнай форме і бяз вучоту рэальных сіл амов-каапэрацыі, прывяло да зьніжэньня загатовак некаторых галін сыравіны, між іншым, лёну і дробных шкур.

У 2-й пал

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Да вясеньняй пасяўной кампаніі.

Ворша, 14-1. Гэтымі днямі перавядзена з Белсельбанку 20000 руб. на загатоўку насеньня траў і лёну, 25000 руб. на загатоўку насеньня вікі і, апрача таго, 2170 руб. на загатоўку гатункавага насеньня ярыны.

Гомель, 14-1. Атрымана з Белсельбанку ў рахунак другога кварталу 1927-28 году 40000 р. на загатоўку насеньня культурных траў і лёну, 3250 р. на загатоўку гатункавага насеньня ярыны.

Белсельбанк да вясеньняй пасяўной кампаніі міркуе завезьці 200 машын для ачысткі насеньня, 150 сялак і шэраг іншых сельска-гаспадарчых машын і прыладаў.

ШКОЛЬНЫ ПЕРАПІС СКОНЧЫЎСЯ.

Віцебск, 14-1. У горадзе і па раёнах скончыўся перапіс на школах сацвыху і прафасьветы. Акрэстатбюро зараз правярае матар'ялы. Затрымлівасьць справаз перапісам культурна-асьветных устаноў гораду. Многія загадчыкі палітшкол і бібліятэк да гэтай пары не падалі вестак аб працы іх устаноў.

«ДОМ АБАРОНЫ» У БАБРУЙСКУ.

Бабруйск, 14-1. Узмоцненым тэмпам ідзе праца па абсталяванню «Дому абароны». Пры доме будзе арганізована вайсковая выстаўка і хімічны кабінэт. Адкрыцьцё „Дому абароны" прыстасавана да гадавіны Чырвонае арміі.

КОНСКІЯ СПАБОРНІЦТВЫ.

Віцебск, 14-1. У Рудніцянскім сельсавеце, за 12 кілёмэтраў ад г. Віцебску, на возеры адбыліся конскія спаборніцтвы. Усяго прымала ўдзел у спаборніцтвах 28 коняй. Першы прыз у 30 руб. атрымаў жарабок гр-на Градоўкіна «Гром», які прайшоў паўтара кілёмэтры ў 2 мінуты і 38 сакунд.

Спаборніцтвы выклікалі вялікую зацікаўленасьць з боку ваколічнага сялянства.

АБСЬЛЕДАВАНЬНЕ ЛЕСАРАСПРАЦОВАК.

Гомель, 14-1. Інспэкцыя працы хутка пачынае абсьледаваньне лесараспрацовак. У першую чаргу будуць абсьледаваны лесараспрацоўкі Чачэрскага і Нісімкавіцкага лясьніцтваў.

ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЕ.

Магілеў, 14-1. На акрузе да гэтай пары земляўпарадкавана 46 проц. усёй плошчы, у гэтым ліку насьля рэвалюцыі—35 проц. Земляўпарадкаваная плошча разьмяркоўваецца так: пад стальпінскімі хутарамі—25 проц., пад хутарамі (авецкага земляўпарадкаваньня—10 проц., пад пасёлкамі—60 процантаў.

ПЕРАВЫБАРЫ Ў СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ.

Бабруйск, 14-1. Перавыбары ў спажывецкіх таварыствах акругі заканчваюцца. На 31 сходзе пайшчыкаў спажывецкіх таварыстваў прысутнічала 11.425 пайшчыкаў і 3.129 чал., яшчэ некаапэраванага грамадзянства. Удзел пайшчыкаў на сходах у сярэднім складаў 60 проц. У праўленьні таварыстваў абрана 194 чал., з якіх беднякоў—54, сераднякоў—45, батракоў—24, служачых—72 і заможных—1. Партыйцаў абрана 72, камсамольцаў—28.

Сельска-гаспадарчая асьвета.

У вёсцы Слабодка райвыканкомам адчынены двохтыднёвыя сельска-гаспадарчыя курсы для сялян. Наша вёска—напярэдадні земляўпарадкаваньня, якое мае распачацца сёлета.

Сяляне, як адзін, адгукнуліся на гэта культурнае мерапрыёмства райвыканкому, і лік слухачоў на курсах складае 63 чалавекі (пры 76 дварох у вёсцы). Наведваюць курсы і жанчыны. Відаць вялікая зацікаўленасьць сялян справаю вывучэньня магчымасьцяў паляпшэньня сельскай гаспадаркі. Праграма курсаў мае на мэце вывучэньне паляводзтва, жывёлаводзтва, пчалярства, садоўніцтва, ветэрынарыі, палітыкі савецкай улады ў сельскай гаспадарцы, каапэрацыі.

Курсы праходзяць пад кіраўніцтвам агранамічнай часткі райвыканкому.

Б. Нікольскі,

Вёска Слабодка, Стара-Дарожскага райёну, Бабруйшчына.

УЗМАЦНІМ БАРАЦЬБУ З САМАГОНКАЙ.

Органамі міліцыі рэспублікі ў сваёй дзейнасьці шмат аддавалася ўвагі барацьбе з самагонакурэньнем і гэтая праца заўсёды насіла ўдарны характар. Але, ня гледзячы на ўсё гэта, самагонакурэньне не зьмяншаецца. Напрыклад, у 1926 годзе адабрана 5.888 апаратаў і 35.203 літры самагонкі, а за 6 месяцаў 1927 г. было адабрана 3.788 апаратаў і 35.341 літр самагонкі. Гэтыя лічбы паказваюць аб тым, што ў далейшым трэба ўжыць усе захады да ўзмацненьня барацьбы з сацыяльным злачынствам—самагонакурэньнем.

Згодна пастановы ЦВК і СНК СССР, зараз уведзен праэкт у ЦВК і СНК БССР аб увядзеньні ў артыкулы 140, 140а, 140б, 140в дадатковых мер сацыяльнае абароны—накладаньне штрафу да 500 руб. і дапаўненьні 140 артыкулу крымінальнага кодэксу: пакаранньня за выраб, хаваньне, рамонт, перадаваньне апарату неабходных спэцыяльна для вырабу самагонкі бяз мэты збыту, ці гэты збыт носіць выпадковы характар.

Апрача некаторых дапаўненьняў артыкулаў Крымінальнага Кодэксу па барацьбе з самагонакурэньнем, Управай Міліцыі БССР намечан цэлы шэраг мерапрыёмстваў па барацьбе з самагонакурэньнем, для чаго неабходна ўжыць наступнае:

1. Для хутчэйшага разгляду ўсіх самагоначных спраў неабходна ўсе справы па вырабу самагонкі накіроўваць непасрэдна на падсудасьці мінуючы следчага.

2. Неабходна прыцягваць да адказнасьці сяброў сельсавету на 107 і 108 артыкулу Крымінальнага Кодэксу, якія не вядуць барацьбы з самагонакурэньнем, ведаючы сутнасьць і месца самога злачынства.

3. Органы міліцыі на мясцох павінны будуць разглядаць справу па самагонакурэньню ў 3-хдзённы тэрмін.

4. Таксама неабходна для насельніцтва ўстанавіць льготны тэрмін для самаахвотнай здачы маючыхся ў іх самагонных апаратаў.

Апрача гэтага, Управай Міліцыі БССР выдадзен загад усім органам міліцыі аб узмацненьні барацьбы з самагонакурэньнем, выяўляючы ў гэтых адносінах асаблівую хуткасьць у разглядзе і выкананьні ўсіх самагоначных спраў. Гэтым загадам таксама даручана органам міліцыі, каб яны паслалі ў райёны конныя рэзервы міліцыі для хутчэйшага спагнаньня штрафаў.

Што датычыцца акруг, то ў іх гэтае пытаньне высунута на першы плян сваёй працы.

На акруговых нарадах начальнікаў райённых міліцый быў ужыты цэлы шэраг практычных дырэктыў па барацьбе з самагонакурэньнем.

Сацыяльнае зло—самагонакурэньне будзе зьнішчана пры шчырай барацьбе органаў міліцыі і пры дапамозе самаго працоўнага насельніцтва, асабліва сялянства.

Дамо прамысловыя тавары вёсцы.

ПАШЫРЫМ ВЫТВОРЧАСЬЦЬ СЯЛЯНСКІХ ТАВАРАЎ.

ШЫРОКАЯ МЭХАНІЗАЦЫЯ Ў ПРАЦКАЛЕКТЫВЕ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ—„МЕНШВЭЙ" У 1-М КВАРТАЛЕ ВЫКАНАЎ ЗАДАНЬНЕ З ПЕРАВЫШЭНЬНЕМ НА 12 ПРОЦ.—ПРАЦКАЛЕКТЫЎ ВЯРОВАЧНІКАЎ ПАВЯЛІЧВАЕ ВЫТВОРЧАСЬЦЬ НА 100 ПРОЦАНТАЎ.

Пашырым вытворчасьць сялянскіх тавараў

(Працкалектыў тэкстыльшчыкаў).

Працкалектыў тэкстыльшчыкаў мае нітачнае, ткацкае і трыкатажныя аддзяленьні ў Менску, і, апрача таго, у кастрычніку 1927 г. у г. Барысаве было адчынена аддзяленьне з трыкатажнай і ткацкай вытворчасьцю.

Гэты працкалектыў выпускае выключна прадукцыю для сялянства.

Трэба адзначыць, што ў працягу апошняга году праведзена вялікая праца ў справе мэханізацыі вытворчасьці: —набыты новыя машыны для выпрацоўкі панчох, а таксама і па іншых аддзяленьнях; частка работы ўжо электрыфікавана. Гэтымі днямі працкалектыў атрымае праз Белдзяржгандаль яшчэ некалькі заграничных машын, і мэхнізацыя будзе значна пашырана.

Ва ўсіх аддзяленьнях працкалектыву зараз працуе каля 300 рабочых, з іх да 90 проц. жанчын, а рэшта—моладзь.

У першыя тры месяцы бягучага гаспадарчага году працкалектыў выпусьціў 30000 мэтраў тканіны шатляндкі і, апрача гэтага, розных нітачных і трыкатажных вырабаў на суму каля 60000 руб. Усё-ж вытворчасьць за першы квартал працкалектывам выканана поўнасьцю на суму да 90000 рублёў.

Удругім квартале вытворчы плян працкалектыву прадугледжвае выпусьціць рознай прадукцыі ня менш чым у першым квартале.

У галіне збыту прадукцыі працкалектыву бярэцца курс на тое, каб яе прадаваць выключна на беларускім рынку. Дзеля гэтага ўжо заключаны дагавор з Белкаапсаюзам на рэалізацыю большай часткі прадукцыі праз вясковую каапэрацыю БССР.

У заключэньне неабходна сказаць, што працкалектыў мае ўсе надставы да пашырэньня, бо попыт на вытворчасьць яго з боку сялянства ўвесь час павялічваецца.

В.

НА 100% БОЛЬШ, ЧЫМ ЛЕТАСЬ.

(Менскі працкалектыў вяровачнікаў).

Наш працкалектыў працуе выключна на вясковы рынак, наогул трэба сказаць, што наш працкалектыў зьяўляецца адзіным у Беларусі, і по ыт на прадукцыю яго ўвесь час расьце.

Зараз у працкалектыве працуе 42 чалавекі. Дзякуючы ўзмоцненаму попыту на прадукцыю, у бліжэйшыя часы працкалектыў пяройдзе на працу ў дзьве зьмены: будзе працаваць замест 42 да 90 рабочых.

У мінулым годзе працкалектыў выпусьціў на рынак розных вяровак каля 7500 пудоў, а **вытворчы плян гэтага году прадугледжвае павялічэньне выпуску супроць леташняга на 100 проц.**

У першыя тры месяцы бягучага гаспадарчага году працкалектыў выпусьціў вяровак на 25.000 руб., а ў другім квартале будзе выпушчана на 40.000 руб. Сыравінай калектыў забясьпечваецца больш-менш здавальняюча і вытворчую праграму мы мяркуем выканаць з перавышэньнем.

Прадукцыю працкалектыву распаўсюджваюць Белкаапсаюз, Цэнтраземсклад, Лесбел і іншыя арганізацыі, якія накіроўваюць яе для забясьпечаньня патрэб сельскай гаспадаркі.

С.

Цэны за год зьніжаны на 25 проц.

(Фабрыка «Меншвэй»).

Год таму назад «Меншвэй» перайшоў на разьдзяленьне працы; у працягу апошняга паўгоддзя адбываецца пераабсталяваньне цэхаў.

З наступнай восені будзе прыступлена да набудовы новага будынку, у якім удасца правесьці поўную мэханізацыю працы і разам з тым пусьціць фабрыку ў 2 зьмены, што, пэнершае, дасьць значнае павялічэньне выпуску прадукцыі і яшчэ больш зьнізіць сабекошт апошняй. Зараз па фабрыцы занята разам з абслугоўваючым пэрсаналам каля 400 чал., а на новай фабрыцы гэты лік падвоіцца.

У забясьпечаньні сыравінай хоць і бывалі перабоі, але на вытворчасьці яны асабліва не адбіліся. У першым квартале вытворчы плян быў выканаць з перавышэньнем заданьня на 10-12 проц.: выпушчана гатовага адзеньня на суму да 700000 руб. Прымаюцца меры да таго, каб перабояў у забясьпечаньні сыравінай ня было і таму вытворчы плян 2-га кварталу мае быць выкананы поўнасьцю і прыблізна на такую-ж суму, як і ў 1-м квартале.

Прымаючы захады да папаўненьня прадукцыі, апошні год у гэтым напрамку даў вялікія дасягненьні: **адпусная цана за год зьніжана на 25%.**

Большасьць прадукцыі «Меншвэю» рэалізуецца ў межах БССР, прычым тавары да спажыўца ідуць выключна праз спажывецкую каапэрацыю.

У апошнія часы заўважваецца попыт на прадукцыю „Меншвэю" з боку нізавой спажывецкай каапэрацыі, якая забясьпечвае выключна вёску.

Прамтавары ў вёску.

Бабруйск, 16-1. Прыняты энэргічныя меры да ўзмацненьня забясьпечаньня вёскі належнымі прамысловымі таварамі. У хуткім часе ў вёску накіроўваецца тавараў фабрычнай вытворчасьці на 300.000 руб. Акрамя таго, мяркуецца вывезьці ў вёску частку тавараў, атрыманых для гораду.

ВЫРАБЫ «ГОСШВЭЙМАШЫНЫ»

Трэст «Госшвэймашына» вызначыў да завозу ў 2-м квартале ў Беларусь: швэйных машын—1.060 штук, жалязкаў (утюгов)—1.350 штук, гадзіньнікаў—625 шт. і прымусаў—390 шт.

Павялічым выраб прамысловых тавараў.

(2 пленум Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР).

АСНОЎНЫ КАПІТАЛ БЕЛАРУСКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ У ДВА РАЗЫ. —ПРАЦУ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ НЕАБХОДНА ЗЬВЯЗАЦЬ З ПРАЦАЮ ПРАМЫСЛОВАЕ ЧАСТКІ С.-ГАСПАДАРКІ.

У ДВА, У ТРЫ РАЗЫ БОЛЬШ ЭНЭРГІІ...

У 12 гадзін дня 15 студзеня адчыніўся II-гі пленум ВСНГ БССР. На парадку дня стаяць пытаньні: 1) прамыслова фінансавы плян на 1927-28 год, 2) дзейнасьць Белпайсаюзу і гандлёвая палітыка прамысловасьці і 3) зьніжэньне адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў.

Адчыняючы пленум, старшыня ВСНГБ тав. Кары сказаў:

— Адчыненьне сёньняшняга пленуму прыпадае з 10-гадовым юбілеем нашай прамысловасьці. У першыя гады ўся наша ўвага была сканцэнтравана на адваўленьні прамысловасьці. У сучасны момант мы можам рабіць чарговыя крокі наперад.

За 10 гадоў працы асноўны капітал нашай прамысловасьці павялічыўся ў два разы.

Мы прынялі прамысловасьць з асноўным капіталам у 27 міліёнаў руб.—цяпер ён дасягае 55 міліёнаў руб.

На 1927-28 год мы вызначаем капітальнае будаўніцтва, якое павялічыць асноўны капітал дзяржаўнай прамысловасьці яшчэ амаль на 27 міліёнаў руб.

З гэтага відаць, што тэмп разьвіцьця нашай прамысловасьці даволі шпаркі. Але ён павінен быць у шмат разоў шпаркішы, чымся ў капіталістычных краінах. Дзеля гэтага нам трэба ўдвоіць, утроіць нашу энэргію.

ЗЬНІШЧЫМ СЫРЦОВЫЯ НЕДАХВАТЫ.

У БССР мы ня можам арганізаваць цяжкую індустрыю. Мы накіроўваем сваю ўвагу на лёгкую індустрыю. Мы арганізоўваем вытворчасьць штучнага валакна. У гэту вытворчасьць увальецца шмат рабочай сілы і адчывіцца матчымасьць стаць у сэнсе манэфактурным багатаю краінаю.

У нас ёсьць і труднасьць, найважнейшая з якіх сырцовая. Цэлы шэраг галін нашай прамысловасьці церпіць гэтыя труднасьці. Яны вельмі сур'ёзныя, але той шэраг мерапрыёмстваў, які мы вычачаем, стушэ іх на нішто. Мы ўкладаем шмат сродкаў на інтэнсыфікацыю прамысловай часткі сельскай гаспадаркі. Гэта мерапрыёмства адыграе рашучую ролю ў навчатковым зьнішчэньні сырцовых недахватаў.

Труднасьці хлебазагатовак дыктуюць нам тую-ж патрэбу увязку працы прамысловасьці з прамчасткаю сельскай гаспадаркі.

КОЖНЫ ПУНКТ ПРАМЫСЛОВА-ФІНАНСАВАГА ПЛЯНУ НЕАБХОДНА ВЫКАНАЦЬ.

Побач з цэлым шэрагам станоўчых бакоў, якія дапамаглі прамысловасьці разьвівацца і падсялі грунт пад яе далейшае разьвіцьцё, 1926-27 год меў і адмоўныя бакі: слабая дастаўка сырцу, невялікі рост вытворчасьці працы, навышаны тэмп росту зарплаты і грашовыя затрудненьні, якія асабліва адчуваліся ў 3 квартале.

Замест праэктаванага прамфінплянам на 1926-27 год зьніжэньне сабекошту прадукцыі, вышла павышэньне на лясной, папяровай і шкляной прамысловасьці і невялікае зьніжэньне (ад 0,5 да 17 проц.) па іншых галінах. У выніку, гэта прывяло да невыкананьня дырэктыў.

Ёсьць значныя посьпехі ў галіне будаўніцтва: капітальныя работы ўзрасьлі з 4.753.000 руб. у 1925-26 г. да 8.880.000 р. у 1926-27 годзе. Гэта надводзіць моцны фундамант пад далейшае разьвіцьцё прамысловасьці.

ШМАТ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ВЫКАНАНЬНЯ ПРАГРАМЫ ДРУГОГА КВАРТАЛУ.

Прымаючы пад увагу, што электрыфікацыя набывае вялізарнае значэньне, дыктуецца неабходнасьць ажыцьцяўленьня пляну электрабудаўніцтва, вызначанага на 1927-28 год на 4.267.000 руб.

Пры выкананьні прамфінпляну 1927-28 году прамысловасьці Беларусі трэба будзе абавязкова выканаць вытворчую праграму другога кварталу. Асабліва гэта неабходна правесьці па галінах, якія вырабляюць рэчы шырокага сялянскага ўжытку: мэталічная, кравецкая, трыкатажная, гарбарская, тэкстыльная і інш.

Асяродкам увагі прамысловасьці павінна быць зьніжэньне сабекошту прадукцыі. Побач з гэтаю працаю, навінна праводзіцца ўсямерная рацыяналізацыя вытворчасьці, ажыцьцяўленьне мерапрыёмстваў, накіраваных да пашырэньня сырцовай базы, правядзеньне ў жыцьцё вызначанага пляну пераводу прамысловасьці на торф і інш.

МАБІЛІЗАВАЦЬ РАБОЧУЮ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ.

Абрахоўваючы ўмовы працы прамысловасьці ў першым квартале, якія стварыліся дзякуючы дрэнная дастаўцы на рынкі прамтавараў, з асаблівай сур'ёзнасьцю неабходна адносіцца да наступнага:

Абавязковага выкананьня вытворчай праграмы ў другім квартале, што забясьпечыць бесперабойную дастаўку сельска-гаспадарчага сырцу для прамысловасьці.

Да ўзмацненьня сувязі з асноўнымі тавара-праводнымі арганізацыямі і да свачасовага рэагаваньня на ўсе зьмены, якія робяцца на рынках.

Выкананьне прамфінпляну 1927-28 году, у зьвязку з некаторай напружанасьцю канъюнктуры народнае гаспадаркі, будзе праходзіць у трудных абставінах. Адзначаючы катэгарычную неабходнасьць наўхільнага выкананьня дырэктыў, пленум зьвяртае асаблівую ўвагу гаспадарчых органаў на мабілізацыю ўсяе рабочае грамадзкасьці завода прамысловага будаўніцтва. Гэта будзе найлепшым залогам паспяховага вырашэньня галоўных задач, якія стаяць перад рэспублікай.

Пленум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі.

15-га студзеня 1928 г. адчыніўся пленум Цэнтральнай Камісіі па палепшаньню жыцьця дзяцей. Даклад аб дзейнасьці прэзыдыуму ЦК ДД зрабіў намесьнік Старшыні ЦК Дапамогі Дзецям т. Будзін.

Мінулы год, гаворыць т. Будзін, ёсьць першым годам, калі работа Дзіцячай Камісіі пранікала па пляну. Матар'яльны стан Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі і акруговых дзіцячых камісій узмацніўся. Так, за мінулы 26-27 год акруговымі дзіцячымі камісіямі зрасходавана 306.000 р., на якія абслужана каля 4.000 дзяцей часткова і 1320 дзяцей абслугоўвалася пастаянна. Цэнтральная Дзіцячай Камісіяй за мінулы год зрасходавана 205.000 руб. Усяго такім чынам Камісіі за 1926-27 год зрасходавалі на барацьбу з дзіцячай бясспрытульнасьцю 511.000 руб.

Калі параўнаць гэтую лічбу з сродкамі, якія выдаткоўцца на барацьбу з дзіцячай бясспрытульнасьцю па дзяржаўным і мясцовым бюджэтам БССР, дык удзельная вага яе будзе складаць 35 проц.

Зараз па БССР налічваецца 274 ячэйкі таварыства «Прыхільнік Дзяцей», у якіх знаходзіцца звыш 18.000 чалавек. Досыць здавальняюча разгарнулі працу Віцебская, Гомельская т-вы „Прыхільнік Дзяцей", а апошнія часы разгортваецца праца Менскага т-ва „Прыхільнік Дзяцей". У далейшым ЦК ДД трэба будзе зьвярнуць пільную ўвагу на разгортваньне масавасьці ў рабоце па барацьбе з дзіцячай бясспрытульнасьцю.

Дзіцячая бясспрытульнасьць—ёсьць зьяўвішча, з якім нам прыдзецца змагацца ня месяцы, а гады, бо, ня гледзячы на досыць значныя дасягненьні, якія мы маем у справе барацьбы з дзіцячай бясспрытульнасьцю, колькасьць бясспрытульных дзяцей па БССР, яшчэ значная.

* * *

У спрэчках па дакладу тав. Будзіна выказаліся ўсе прысутнічаўшыя пасяджаньні члены камісіі і прадстаўнікі акругаў.

Раніцяе пасяджэньне 16-і пачалося дакладам Народнага Камісарыяту Аховы Здароўя.

Прамова тав. Чарвякова

на пленуме Цэнтральнае Дзіцячае Камісіі пры ЦВК БССР 15 студзеня 1928 году.

Я хачу крыху застанавіцца і растлумачыць некаторым таварышам, якія задачы ўскладзены на Цэнтральную Дзіцячую Камісію. Цэнтральная Камісія па палепшаньню жыцьця дзяцей — ёсьць установа, якая вялучаецца Прэзыдыумам ЦВК БССР і абъядноае ўсю працу ўстаноў і арганізацый па барацьбе з дзіцячай бясспрытульнасьцю.

Савецкія ўстановы, як цэнтральныя, так і мясцовыя, у сваёй штодзённай працы павінны займацца работаю па барацьбе з дзіцячаю бясспрытульнасьцю, а Цэнтральная Дзіцячая Камісія гэтую работу абъядноае і аказвае ім як арганізацыйную, так і матар'яльную дапамогу.

З попыту відаць, што некаторыя ўстановы ў галіне барацьбы з дзіцячай бясспрытульнасьцю праводзяць значную працу, а іншыя зусім гэтай работы не праводзяць.

Нам трэба загастрыць пытаньне, каб установы прымалі актыўны ўдзел у рабоце па барацьбе з дзіцячай бясспрытульнасьцю. Трэба, каб установы менш зварочваліся ў Дзіцячую Камісію за сродкамі, а самі-бы намячалі тыя ці іншыя мерапрыёмствы і знаходзілі спосабы іх ажыцьцяўленьня.

Мяне вельмі задавальняе тое, што таварышы, якія выступалі ў спрэчках па дакладу т. Будзіна, гаворыць не аб колькасным пашырэньні дзейнасьці Камісіі, а ўсе як адзін шукаюць спосабаў, як-бы палепшыць наладзіўшуюся работу дзіцячых камісій. Гэта паказвае, што ЦДК у сваёй работе пераходзіць на вышэйшую ступень.

Мінулы пленум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі быў год таму назад. За час паміж першым і другім пленумамі ЦДК у сваёй рабоце мае значныя посьпехі. Дзіцячыя камісіі на месцах арганізаваны, аформіліся, праца іх вядзецца больш плянава і сыстэматычна. Матар'яльны стан як цэнтральнай, так і акруговых дзіцячых камісій палепшаўся. На тое было год таму назад. Тады работа дзіцячых камісій была вельмі слабою.

З асноўных недахопаў у рабоце дзіцячых камісій трэба лічыць адсутнасьць масавасьці. Трэба паставіць у далейшым задачу большага ажыўленьня работы таварыства «Прыхільнік Дзяцей», большага ўцягненьня членаў у гэтае таварыства.

На месцох трэба выхаваць кадр актыву, які-б цікавіўся справаю барацьбы з дзіцячаю бясспрытульнасьцю, бо гэта праца надта цяжкая. Ячэйкі т-ва „Прыхільнік Дзяцей" павінны быць тымі шчупальцамі, праз якія павінна праводзіцца на месцох уся грамадзкая праца па барацьбе з дзіцячаю бясспрытульнасьцю. Калі мы прыцягнем да справы барацьбы з дзіцячай бясспрытульнасьцю і нашу грамадзкасьць, то можна будзе ў далейшым мець больш значныя посьпехі.

Трэба ўцягваць у справу барацьбы з бясспрытульнасьцю шырокія працоўныя масы, і наша рэспубліка пазбавіцца ад цяжкай спадчыны мінулага—бясспрытульнасьці.

Менская акруг. канфэрэнцыя камсамолу

ПРЫВІТАНЬНЕ АД КАМСАМОЛЬЦАЎ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ І ПОЛЬШЧЫ.

14-га студзеня 245 дэлегатаў Менскай акруговай канфэрэнцыі камсамолу ў прысутнасьці шмат гасьцей, запоўніўшых вялікую залю клюбу Карла Маркса,—прыступілі да працы.

Адчыніўшы канфэрэнцыю, **сэкратар Менакругкому ЛКСМБ тав. Красоўскі** сказаў: за час з мінулай акруговай канфэрэнцыі наша арганізацыя ўпарта працавала над выкананьнем тых задач, якія былі ёй пастаўлены XIV зьездам УсеКП(б) і VII зьездам УсеЛКСМ.

Мы змагаліся за ідэалёгічную чыстату арганізацыі, супроць трацкісцка-меншавіцкіх ухілаў у камсамоле, за ленінскае адзінства нашага саюзу.

* * *

З вялікім захапленьнем быў спатканы канфэрэнцыяй тав. **Альшэўскі, былы кіраўнік камсамолу Заходняй Беларусі**, які перадаў канфэрэнцыі гарачае і баявое прывітаньне ад камсамолу і ўсёй рабоча-сялянскай моладзі Заходняй Беларусі і Польшчы.

— Ня гледзячы ні на якія катаваньні буржуазіі і цяжкасьці працы, заходнія браты давядуць сваю барацьбу да канчатковай перамогі.

Тав. Альшэўскі перадаў канфэрэнцыі яшчэ прывітаньне ад двох менскіх камсамольцаў, якія зараз тамяцца ў турмах панскай Польшчы: ад **Веры Харунжай і Зандэра**, якіх добра памятаюць старыя менскія камсамольцы.

— Я запэўняю вас, што ўсе камсамольцы Заходняй Беларусі, як адзін стаяць за Ленінскі ЦК, за Камінтэрн.

— Няхай жыве злучаная Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка. Няхай жыве злучаны Ленінскі Камсамол Савецкай Беларусі.

* * *

У Прэзыдыум канфэрэнцыі абіраецца 29 чалавек, у тым ліку: т. т. Акулік (АК КП(б)Б), Альшэўскі, Чарняк, Бараньнікаў і Сазырын (ад ліквідаванага «Парыская Камуна»).

Потым канфэрэнцыя заслухала даклад тав. Акуліка аб вынніках XV зьезду УсеКП. Па дакладу аднагалосна прынята рэзалюцыя, у якой гаварыцца аб поўным далучэньні камсамольскай арганізацыі да рашэньняў XV зьезду УсеКП.

* * *

На раніцнім пасяджэньні канфэрэнцыі 15-га студзеня тав. Бараньнікаў зрабіў даклад аб рабоце ЦК ЛКСМБ за апошнія 2 гады.

Тав. Бараньнікаў у сваім дакладзе адзначыў, што дзякуючы энэргічнай працы саюзу, галоўны недахоп, які быў у працы камсамольскай арганізацыі:—разыходжаньні паміж зьместам працы камсамолу з запатрабаваньнямі рабоча-сялянскай моладзі, да сучаснага моманту значна зьнішчаны.

Рабоча-сялянская моладзь Беларусі ідзе за камсамолам і працуе пад яго кіраўніцтвам. Аб гэтым лепш усяго кажуць лічбы росту нашага саюзу. За перыяд з 1926 году ЛКСМБ вырас з 40913 чал. да 61.357. Пралетарскі асяродак у ЛКСМБ складае зараз 38,9 проц.

На маючыхся вестках колькасьць рабочай моладзі, уступіўшай у ЛКСМБ па Кастрычнікаваму закліку, складае 1.996 чал.

На раніцнім пасяджэньні 16 студзеня канфэрэнцыя заслухала справаздачу тав. Красоўскага аб рабоце акругкому. Па дакладу разгарнуліся гарачыя спрэчкі. Дэлегаты дзеславіта абгаварвалі працу АК.

Р. Г—зін.

Па чатырох краінах.

(Уражаньні і сапраўднасьць).

Вэрсаль.

Вакол Парыжу мясцца шмат цікавых прыгожых ваколіц. Заехаўшы ў Парыж, нельга было іх не наведаць, не пазнаёміцца з імі. Але брак часу адбіваўся на гэтым нашым жаданьні. Выпаўніць яго цалкам, ці хоць бы і палавіну—мы не маглі. Усё ж мы не абмінулі, каб не пабыць у Вэрсалі. Знаёмячыся з гісторыяй Францыі і у асобку, з гісторыяй Парыскае Камуны, нам вельмі часта даводзіцца сустракацца з гэтым горадам. Непачэсная роля арганізацыі рэакцыі адыгрывалася ў ім. У Вэрсалі сталіў штаб Мак-Магона, у якім дранежны Цьер складаў свае пляны разгрому Камуны і расстрэлу камунараў. Раней гэтага, калі яшчэ ў Францыі кіравалі каралі—Вэрсаль быў месцам іх прабываньня, ветняю рэзыдэнцыяй францускіх каралёў. Фактычна Вэрсаль з гэтага боку падобны да раней Царскага, а зараз Дзецкага Сяла каля Ленінграду, ці Поддстаму каля Бэрліну.

Вэрсаль знаходзіцца на поўдзень-захад ад Парыжу, у прыгожай гарыстай мясцовасьці. Да яго з Парыжу вядзе некалькі дарог, як: чыгунка, электрычная жалезная дарога, трамвай і шаша. Адгон паміж Парыжам і Вэрсалем, які цягнецца да дваццаці кілёмэтраў, спрэс заселены дачамі і зарошчаны садамі і паркамі. Сама паездка з Парыжу ў Вэрсаль і назад падае шмат прыемнасьці. Праз усю дарогу ты любуешся дробнымі (елымі домікамі-дачкамі, мінаючы гародчыкамі і садкамі, перакідваючы погляды на густыя нямежаныя паркі. Чыгунка і электрычка вялікі кавалак адгону паміж Парыжам і Вэрсалем праходзіць тунэлямі, якія прабіты ў значных узвышшах, аддзяляючых гэтыя два гарады.

Самы Вэрсаль досыць значны гарадок. У ім ужо ў часы Францускае рэвалюцыі мелася ажно сто тысяч жыхароў, якія займаліся і займаюцца зараз пераважна фабрыкацыяй гадзіньнікаў, варужжа, інструментаў, жалезнай і меднай утвары, кашміровых шаляў і інш.

Зараз прыдворнае значаньне Вэрсалю адышло далёка ў гісторыю. Публіка езьдзіць у Вэрсаль выключна для агляду помнікаў гісторыі і для праводу часу ў яго шыкарных палацных парках з многалікімі мастацкімі фантанамі.

Мы намецілі дзён паездкі ў Вэрсаль нядзелю. Звычайна нядзелямі адчыняюцца фантаны, а гэта нас асабліва цікавіла. А дваццатай гадзіне ўдзень мы прыехалі на Заходні вакзал і ў маленькіх цесных двухпавярховых дачных вагончыках адправіліся з Парыжу. Незабыванны абраз яго разьлёгся перад намі, калі мы ўзьехалі на высокае месца, пад якім слаўся горад. Мы не адрываліся ад вокан вагону, пакуль цягнік ня ўехаў у тунэль.

У Вэрсалі мы зьлезлі з цягніку і ачуліся ў дрэнькіх бедным вакзальчыку. Тэю-ж шэрасьцю дыхнула на нас, калі мы выйшлі на прывакзальную вуліцу. Маленькі спакойлівы трамвай пра-бег каля нас, напоўнены людзьмі. Ніяк не вабіла сесьці ў яго, бо якраз дзень выдаўся сонечны, цёплы. Мы рашылі пайсьці на акрэсьлены час рэмізьніка, які-б нас абанёс усе выдатныя месцы і пазнаёміў нас з імі. Рэмізьнікаў доўга шукаць ня трэба—яны тутжа, каля вакзалу. Нават адзін з іх, угледзіўшы нас, хутка падэхаў к нам і запрапанаваў правесьці. Мы доўга не разважалі, умовіліся з цаною і паехалі пуставатаю вуліцаю ў палацны парк. Рэмізьнік, гадоў шэсьцьдзесят дзядуля, эльзасец, напаўся словаахвотлівым і ведаючым нямецкую мову. Толькі мы селі на воз, як ён пачаў нам расказваць аб кожнай рэчы, ня мінаючы і вадаправодных станцыі. У парку, куды мы хутка ўехалі, на нас зьвярнула ўвагу яго неахайнасьць і брудназьць. На бакох роўнае, незьмярымае вокам алеі-шашы, па якой стрэламі насіліся таксі, матацыклы, валёсыпэды, ляжала ламачча, кучы лісьця. Відаць, што людская рука на працягу многіх гадоў ня кратала дзікай травы, кустоў, якія дапаміналі сабою дзікі лес. Міжвольна ўспамінаўся нам чысты-чысьцюхенькі, якзуратна дагледжаны багаты Потсдамскі парк. Я не абмінуў, каб ня выказаць розьніцы між францускаю натураю і натураю нямецкаю. Але любячы пярэчаньне, М. Зарэцкі адказаў на маю заўвагу тым, што, па ягонаму, парк лепі выглядае тады, калі ён прадстаўляе натуру. Яго ніхто не падтрымаў у гэтым. І мы пацікавіліся ў рэмізьніка, чаму такі мясцца гэткая неахайнасьць. Той нам растлумачыў, нібы гэта робіцца знарок, бо, ці праўда ці не, тыя, хто клапоціцца аб парку, рашылі захоўваць яго такім, якім ён быў у час пераходу ад маемасьці каралеўскай у народную маемасьць. Чаму гэта так надавуміла людзям, рэмізьнік і сам ня ведае.

Пакінуўшы вырашэньне пытаньня аб прычынах недагляду за садам, мы перайшлі да палацаў, на якія нам паказваў працягнутую пугаю рэмізьнік. Гэта быў палац так празываны Вялікі Тріанон. У ім жылі апошнія францускія каралі. Марыля Антуанэта часта тупала, азіраючы парк, па шырачэзных яго тэрасах. Палац паказаўся нам просьцецькім і звычайным будынкам, які хаваўся за верхавіны паркавых дзярэў. Рэмізьнік нас пераняў, паведаміўшы, што мы яго магчымем разглядзець з другога боку. Гэта не дало нам выводзіць тыя ці іншыя заключэньні. Аднак і тады, калі мы падэхалі к невялікаму пляцу, з якога мясцца ўвойсьце ў Вялікі Трыанон—апошні злоўжываў, па нашаму, сваёю вялікасьцю. Можна дзівіцца таму, наколькі ён бядней, прасьцей і мізарней ад палацаў былых расейскіх цароў, або нямецкіх кайзэраў. Праўду кажучы, яго квадратовага аднапавярховага, самага простага стылю жоўтага будынку, падзеленага калёнадай на д

Хроніка.

Усебеларускі зьезд членаў калегіі абаронцаў.

На гэтых днёх закончыўся ўсебеларускі зьезд членаў калегіі абаронцаў. Пры адчыненьні зьезду выступіў з прывітальнай прамовай Наркамюст т. Сэгаль, які адзначыў дасягненьні калегіі ў справе наближэньня юрыдычнай дапамогі насельніцтву.

Справаздачу аб дзейнасьці ўсебеларускага аб'яднаньня калегіі праваабаронцаў зрабіў старшыня прэзыдыуму калегіі т. Слонім. Дакладчык адзначыў павялічэньне бясплатнай юрыдычнай дапамогі насельніцтву ў параўнаньні з мінулым годам, павялічэньне бясплатнай кансультацыі, бясплатных выступленьняў на судох і г. д.

Тав. Корсак паінфармаваў зьезд аб культпрацы калегіі. Дакладчык адзначыў, што калегія правяла цэлы шэраг дакладаў на прадпрыёмствах і на вёсцы. У спрэчках выступілі 15 чалавек. Прамоўцы гаварылі, што трэба ўзмацніць унутраную вучобу і самаадукацыю членаў калегіі, у сваёй працы калегія павінна яшчэ шчыльней набліжацца да насельніцтва.

Абраны новы прэзыдыум у складзе 11 асоб. У бюро прэзыдыуму ўвайшлі наступныя асобы: старшыня прэзыдыуму т. Слонім, намесьнік старшыні т. Васкабойнікаў і адказны сэкратар т. Корсак.

У працкалектывах будзе занята каля 11.000 чалавек.

У гэтым годзе працкалектывы БССР будуць значна папыраны, дзякуючы чаму будзе дадзена работа 2.815 беспрацоўным. Такім чынам к канцу 1927-28 году ў працкалектывах будзе працаваць каля 11.000 чал.

Завоз аўса і атрубей.

У студзені месяцы Белкаспасаюз мяркуе завезьці 150 вагонаў аўса і атрубей для патрэб спажыв. кааперацыі.

Навучныя камандыроўкі.

Наркамасьветы ў гэтым годзе мяркуе выдаць да 50 навучных камандыровак прафэсарам, вучоным, пісьменнікам і г. д.

25.000 руб. на закупку племянной жывёлы.

Белсельбанк адпусьціў Белсельтрэсту 25.000 руб. доўгатэрміновага крэдыту для закупкі племянной жывёлы для савецкіх гаспадарак БССР.

Менскае акруговае зімовае сьвята фізкультуры.

Лыжныя спаборніцтвы.

Менскае зімовае сьвята фізкультуры адчынілася ў суботу, 14 студзеня, лыжнымі спабо ніцтвамі (на гледзячы на вельмі дрэнае надвор'е). Спаборніцтвы прыцягнулі 30 лыжнікаў і лыжніц і скончыліся 15-га студзеня.

Вынікі спаборніцтва гэткія:

У дыстанцыі на 3 кілёмэтры для жанчын першае месца заняла т. Грузд (23 мін. 16,8 с.), другое т. Макарэвіч (23 мін. 18,8 с.) і трэцяе т. Сашко (23 м. 23,8 с.), (усе калектыву Зах. Бычкі).

У дыстанцыі на 5 клм. для мужчын першым быў т. Старасьценкаў (АБВШ) у 24 мін. 12,9 с., другое— т. Баўкоўскі ў 24 м. 33,9 с. і трэцяе т. Табіаш у 25 м. 58,9 с.

У дыстанцыі (ваенізаванай у вайсковым снаражэньні) на 10 кілёмэтраў першае месца заняў т. Шчэрбакоў (1 гадз. 20 мін. 54,1 с.), другое т. Старасьценкаў Е. (1 г. 21 м. 5,1 с.) і трэцяе т. Казлоў (1 г. 21 м. 25,6 с). Спаборніцтвы праходзілі па перасечанай мясцовасьці.

Агульнае калектыўнае першынства завяў калектыў АБВШ.

1 дзень спаборніцтваў па падняцьцю цяжараў.

Выжыманьне дзьвума рукамі: у вазе пяра першым т. Савіч (65,5 кілё), у лягчэйшай—т. Равічбах (Барысаў)—69,3 кілё, у лёгкай—т. Серабранскі—69,3 кілё, у сярэдняй —т. Сьвечнікаў—77,5 кілё, у паўцяжкай—т. т. Кузьмін, Сальнікаў і Бяркоўскі—69,3 кілё, у цяжкай т. Вайс —73,9 кілё.

Вырываньне аднэй рукой.

Першыя месцы занялі т. т. Савіч (вага пяра)—55 кілё, Равічбах (лягчэйшая)—59 кілё, Зубрыцкі (лёгкая) —60,7 кілё, Сьвечнікаў (сярэдняя) —67,3 кілё, Кузьмін (паўцяжкая)— 67,3 кілё і Вайс (цяжкая)—60,7 кілё.

1 дзень спаборніцтваў па барбе.

Вага пяра: Соскін—Окунь правялі барбу ў нічыю.

Лягчэйшая вага: цікавую барбу далі Мэханік—Вайніловіч, прычым перамогу атрымаў першы ў 9 м. 17,6 с.

Лёгкая вага: Графутка атрымаў у 48 сэк. перамогу над Цыбуленкавым.

Сярэдняя вага: барба Прыдачко і Крупскага дала перамогу першаму ў 4 м. 48 с.

Паўцяжкая вага: Самковіч—Яноўскі правялі барбу ў нічыю, але за актыўнасьць паўперамогі прысуджана Яноўскаму.

СУД.

СПОСАБ НЕ ПАПАСЬЦІ Ў ПАПРАЎЧЫ ДОМ.

Нашы гаспадыні, якія штодню ходзяць купляць мяса на Ніжні рынак, маглі-б заўважыць у чарзе бойкую кабеціну, якая цёнгле лабунілася да тых жанчын, у якіх кішэні вельмі раставаліся. Гэта была кваліфікаваная рэцэдывістка Ганна Рулькевіч, якая вышукала лёгкі спосаб зарабляць сабе на абеды і вячэры, толькі лагодка выцягваючы з кішэнь няўважлівых жанчын усе іх грошы.

Рулькевіч ня раз ужо пападалася за крадзяжу, але кожны раз яна прыводзіла на суд сваіх дзяцей, а раз дзяцей няма куды дзець, то Рулькевіч пакідалі на волі.

У верасьні мінулага году Рулькевіч выцягнула ў грамадзянкі Рабіновіч грошы з кішэні.

На гэтых днях яе судзіў парсуд 1-га вучастку. На стараму звычаю Рулькевіч прывяла з сабой на суд сваіх дзяцей. Але суду надаела з ёй цацкацца, і ён прыгаварыў яе на паўтара гады, але на падставе амністыі скараціў кару да 9 месяцаў турэмнага зьняволеньня.

Дзяці ў Рулькевіч пастаноўлена зьмясьціць у дзіцячы дом.

Рознае.

Л. ТЭРМЕН ЗА ГРАНІЦАЙ.

„Тэрмэнвокс", новы музычны струмант, названы таленавітым савецкім фізыкам Л. Тэрменам, зрабіў вялікую сэнсацыю заграніцай. Апошнія выступленьні Л. Тэрмена ў Бэрліне прайшлі з вялікім посьпехам.

КІРАВАНЬНЕ МАТОРНАЙ ЛОДКАЙ ПА РАДЫЁ.

Францускі інжэнэр Шово зрабіў маторную лодку, якой кіруюць з берага па радыё. У чарзе выпрабаваньняў лодка ішла з хуткасьцю 65 кілёмэтраў у гадзіну.

ДРАПЕЖНІЦКІ НОРАЎ БУРЖУАЗЕІ.

Вастрожная ўправа ў амэрыканскім горадзе Трэконе надрукавала ў газэтах, што яна прадае 100 білетаў на права прысутнічаць у часе пакараньня сьмерцю 4-х забойцаў. За вялікія грошы на катаваньні прысутнічалі шыкозна ўбраныя мужчыны і жанчыны.

КІНО-АПАРАТ У КІШЭНІ.

У Амэрыцы выпушчан у продаж маленькі кіно-апарат з лямпай, якая дае асьвятленьне не слабей, чымся дзённы сьвет. Апарат розам з лямпай лёгка зьмяшчаецца ў кішэні.

ДРАЎЛЯНАЯ МУКА.

Злучаныя Штаты Амэрыкі вывозяць значную колькасьць драўлянай мукі, якая робіцца з пілавіньня, стружак, трэсак і г. д. Гэту муку карыстаюць розным спосабамі: яе прымешваюць пры вырабе лінолеуму, яна ідзе на розныя цацкі, на некаторыя часткі радыё-апарату і г. д. Драўляную муку карыстаюць таксама пры вырабе ўзрыўчатых мататр'ялаў.

НОВЫ СПОСАБ УЖЫВАНЬНЯ ЛЯКАРСТВАЎ.

Досьледы шэрагу савецкіх і замежных вучоных паказалі, што лякарствы, загадзя зьмешаныя з крывёй, значна хутчэй і выразьней уплываюць на хваробу, чымся лякарствы, прынятыя ў чыстым выглядзе. Гэта было даказана на трох найчасьцей практыкуемых лякарствах: на хініне, салісылавым натры і изо-сальварсане (914).

ВОПЫТЫ ЗАФАРБОЎВАНЬНЯ БЯЛЬМА.

Клініка Казанскага унівэрсытэту зараз робіць вопыты на афарбоўваньню бяльма на воку. Дзеля гэтага на бяльмо кладзецца кавалак ваты, прапітаны хлорыстым золатам. Да гэтага часу зроблена такім спосабам больш 25 афарбовак.

ТЭАТР-КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

Серада, 18 і нядзеля, 22 студзеня

ВЕЧАР БЕЛАРУСКАЕ КАМЭДЫІ.

„ПІНСКАЯ ШЛЯХТА", камэдыя ў адной дзеі, 1866 г.

„МОДНЫ ШЛЯХЦЮК", бытавая камэдыя ў адной дзеі.

„ЧОРТ І БАБА", камэдыя ў адной дзеі.

ПАЧАТАК А 8 З ПАЛОВ. ГАДЗ.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА» — З АЎТОРКА „ТАКАЯ ЖЕНЩИНА" з удзелам Маліноўскай.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". — Мастацкая фільма „НЕМОЙ ДРУГ" драма ў 6 частках. ЧАРГОВАЯ ПРАГРАМА „ВАРЬЕТЭ"

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». — „ВТОРАЯ ЖЕНА" Пачатак сэансаў: 6, 7 з палов., 9 і 10 з палов. гадзін. ЧАРГОВАЯ ПРАГРАМА „СУМКА ДИПКУРЬЕРА"

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ". — „ПЫЛКАЯ ЮНОСТЬ" ДРАМА Ў 7 ЧАСТКАХ. Звыш праграмы: выступленьне мас-артыстаў ленінградзкіх тэатраў МУРАТАВАЙ.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БЕЛАРУСКАЙ ССР.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

аб самаабкладаньні насельніцтва.

Паводле пастановы ЦВК і СНК Саюзу ССР „Аб самаабкладаньні насельніцтва" (З.З. СССР 1927 г., № 51, арт. 509) і паводле даручэньня 2-й сэсіі ЦВК БССР VIII скліканьня Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Для задаволеньня мясцовых гаспадарчых, культурна-асьветных, санітарных і дабрабытных патрэб сельскага насельніцтва можа ўстанаўляцца абавязковая для ўсіх грамадзян да ага насельніцтва самаабкладаньне ў межах і ў парадку, прадугледжаных гэтаю пастановаю:

а) на арганізацыю, утрыманьне і абслугоўваньне (будаваньне новых, дабудаваньне нескончаных, пашырэньне, наймаьне, капітальны і бягучы рамонт будынкаў, абсталяваньне, апал і асьвятленьне) гаспадарчых, культурна-асьветных і санітарных устаноў мясцовага грамадзкага значэньня: школ, хат-чытальняў, клюбаў, чырвоных куткоў, дзіцячых дамоў, ясьляў і пляцовак, больніц, доктарскіх, фэльчарскіх, акушэрскіх і аграномічных пунктаў, дамоў для інвалідаў і для састарэлых, начлежных дамоў, лазьняў і хлеба-запасных магазынаў;

б) на ўпарадкаваньне населішч: каналаньне і ўтрыманьне ў парадку студняў, грамадзкіх сажалак, пляцоў, магільнікаў для здохлай жывёлы, плошчаў грамадзкага карыстаньня (выгана, лугоў), а таксама на ўтрыманьне начных і паліўных вартаўнікоў,

в) на правядзеньне новых, утрыманьне і рамонт існуючых дарог, мастоў, грабляў, пераправ і пераводаў, што маюць мясцовае грамадзкае значэньне;

г) на супрацьпажарныя мерапрыёмствы: будаваньне, капітальны і бягучы рамонт і гаспадарчае ўтрыманьне пажарных дэпо і хлявоў, на набываньне і ўтрыманьне супрацьпажарных машын і прылад, на ўтрыманьне пажарных вартаўнікоў;

д) на ўтрыманьне лясьнікоў і лесакультурныя работы ў лясох мясцовага значэньня.

2. Забараняецца самаабкладаньне на патрэбы адміністрацыйнага характару (аплата ра отнікаў мясцовых органаў улады: райённага выканаўчага камітэту, сельскага савету, міліцыі, сельскіх выканаўцаў і інш., утрыманьне і абсталяваньне для іх памяшканьняў, а таксама канцылярскія, разьезныя і іншыя выдаткі).

3. Агульны разьмер самаабкладаньня на адзін год ня можа перавышаць 35 проц. агульнай сумы сельска-гаспадарчага падатку па акладных лістох за даны год з усяго ліку гаспадарак данага населішча.

4. Самаабкладаньне дазваляецца і ў грашовай і ў натуральнай форме, а таксама працоўным удзелам.

5. Пытаньні аб устанаўленьні самаабкладаньня паднімаюцца па ініцыятыве сельскага савету, паасобных грамадзян або груп грамадзян і грамадзкіх арганізацый і вырашаюцца на агульных сходах грамадзян, якія склікае сельскі савет. Для ўстанаўленьня самаабкладаньня патрэбна прысутнасьць на агульным сходзе ня менш паловы агульнага ліку грамадзян данага населішча, якія карыстаюцца выбарнымі правамі.

Увага. Калі на першы агульны сход грамадзян па пытаньні аб самаабкладаньні зьявіцца менш паловы агульнага ліку грамадзян, якія маюць выбарныя правы, то склікаецца другі агульны сход. Для вырашэньня пытаньняў аб самаабкладаньні на другім сходзе павінна прысутнічаць ня менш 1/3 часткі ўсяго ліку грамадзян, якія маюць выбарныя правы.

6. Пытаньне аб увядзеньні самаабкладаньня і ўсе іншыя пытаньні на сходзе аб самаабкладаньні вырашаюцца простаю большасьцю галасоў грамадзян, што маюць выбарныя правы.

7. Калі трэба задаволіць агульную патрэбу двух або некалькіх населішчаў, якія ўваходзяць у адзін сельскі савет, то пытаньне аб увядзеньні самаабкладаньня можа вырашацца і на агульных сходах грамадзян кожнага населішча ў паасобку, і на абʼяднаным агульным сходзе грамадзян усіх зацікаўленых населішчаў, з тым, каб на гэтым абʼяднаным агульным сходзе прысутнічала ня менш паловы агульнага ліку грамадзян, якія карыстаюцца выбарнымі правамі, з кожнага зацікаўленага населішча. Калі-ж задаволеньне данай грамадзкай патрэбы тычыцца некалькіх населішчаў, абʼяднаных рознымі сельскімі саветамі, то пытаньне аб увядзеньні самаабкладаньня перадаецца на абмеркаваньне агульных сходаў праз адпаведны райённы выканаўчы камітэт.

8. Агульны сход грамадзян данага населішча можа зьняць самаабкладаньне з паасобных найбольш занапаласьлых гаспадарак.

9. На агульным сходзе павінны быць вырашаны наступныя пытаньні: а) мэтад самаабкладаньня; б) формы самаабкладаньня (грашовая, натуральная або працоўная); в) агульны разьмер самаабкладаньня; г) кра ці тэрмін уносу на самаабкладаньне, прычым, калі самаабкладаньне ўстанаўляецца ў відзе рэгулярных уносаў, то ў пастанове трэба адзначыць тэрмін, на які вызначаецца самаабкладаньне, але ў кожным разе ня больш аднаго году. Усе вырашаныя пытаньні павінны быць запісаны ў пастанове, прынятай агульным сходам, якая падпісваецца прэзыдумам сходу.

10. Не пазьней трох дзён ад дня атрыманьня пастановы агульнага сходу грамадзян населішча аб самаабкладаньні, сельскі савет з удзелам прадстаўніка сялянскага камітэту ўзаемадапамогі робіць раскладку агульнай сумы самаабкладаньня паміж паасобнымі гаспадаркамі і грамадзянамі данага населішча, прычым захоўваюцца наступныя правілы: раскладка робіцца прапарцыянальна суме сельска-гаспадарчага, прамысловага і падаходнага падатку, якія плацяцца данаю гаспадаркаю або асобаю на працягу году. Гаспадаркі, з якіх зьнят сельска-гаспадарчы падатак, абкладваюцца прапарцыянальна суме налічанага сельска-гаспадарчага падатку. Саматужнікі, з якіх зьнят падатак, абкладаюцца на сярэдняй стаўцы гаспадарак, плацячых сельска-гаспадарчага падатку.

Увага. Грамадзяне, якія знаходзяцца на дзяржаўнай службе і не вядуць самастойнай сялянскай гаспадаркі, па прыцягваюцца да самаабкладаньня ў тых выпадках, калі яны не атрымоўваюць беспасрэднай карысьці ад мерапрыёмстваў, на якія робіцца самаабкладаньне.

11. Сельскі савет мае права на падставе хадайніцтваў паасобных гаспадарак або асоб дазволіць зьмену вызначанай агульным сходам формы самаабкладаньня іншаю формаю, напрыклад, замест грашовай натуральныя ўносы або працоўны ўдзел. Пры такой зьменэ сельскі савет павінен, галоўным чынам, узяць пад увагу інтарэсы заняпалых груп сельскага насельніцтва.

12. Раскладка самаабкладаньня не пазьней тыдня ад дня зацьверджаньня яе сельскім саветам абвяшчаецца насельніцтву праз сельскіх выканаўцаў над расьпіскі.

13. На працягу двух тыдняў ад дня абвяшчэньня раскладкі зацікаўленыя грамадзяне маюць права падаць у сельскі савет скаргу на пастанову аб самаабкладаньні наогул, а таксама аб раскладцы.

14. Пасьля скаканьня тэрміну, паказанага ў папярэднім артыкуле, сельскі савет накіроўвае ў райённы выканаўчы камітэт пастанову агульнага сходу грамадзян аб самаабкладаньні з сваім заключэньнем, раскладку яго і ўсе атрыманыя скаргі.

15. Райённы выканаўчы камітэт можа скасаваць пастанову сходу грамадзян аб самаабкладаньні ў наступных выпадках: а) калі агульны сход грамадзян, які прыняў пастанову аб самаабкладаньні, ня моў законнай сілы, або калі былі дапушчаны грунтоўныя парушэньні гэтай пастановы; б) калі мерапрыёмствы, для ажыцьцяўленьня якіх зроблена самаабкладаньне, не прадугледжаны гэтаю пастановаю; в) калі перавышан вызначаны для данага населішча гранічны разьмер самаабкладаньня.

16. Калі ня правільна ўстаноўлена раскладка, то райённы выканаўчы камітэт павінен незалежна ад таго, ці ёсьць скаргі на раскладку, ці не, зрабіць у іх патрэбныя зьмены.

17. Калі на працягу двух тыдняў ад дня падачы сельскім саветам у райённы выканаўчы камітэт пастановы агульнага сходу грамадзян аб самаабкладаньні яна ня будзе скасавана райённым выканаўчым камітэтам, а таксама, калі райённы выканаўчы камітэт ня зробіць зьмен у раскладцы паданай сельскім саветам, то пастанова аб самаабкладаньні і раскладка лічацца зацьверджанымі і зьяўляюцца абавязковымі для ўсіх грамадзян данага населішча.

18. Райённы выканаўчы камітэт, адмовіўшы ў задаволеньні скаргі, павінен абвясьціць асобе, падаўшай скаргу, падставы адмаўленьня. На паказаныя пастановы могуць падавацца скаргі ў акруговы выканаўчы камітэт, пастановы якога зьяўляюцца канчатковымі. Падача скаргі на пастанову райённага выканаўчага камітэту не прыпыняе пастановы аб самаабкладаньні.

19. Калі пастанова аб задаволеньні скаргі вынесена была пасьля таго, як раскладка набыла сілу, то сума, учэсная асобаю, падаўшаю скаргу, альбо спагнаная з яе, павінна быць залічана пры новым самаабкладаньні ў даным населішчы або зьвярнута.

20. Нядоімкі па самаабкладаньні спагнаюцца сельскім саветам у адміністрацыйным парадку, які ўстаноўлен для спагнаньня падаткаў.

Увага. Калі ў вызначаны тэрмін ня будзе выканана насельніцтвам самаабкладаньне працоўным удзелам, то кошт такіх работ пераводзіцца асобнаю пастановаю сельскага савету на грошы і спагнаецца паводле гэтага артыкулу.

21. На ажыцьцяўленьні самаабкладаньня на сельскі савет усклядаюцца наступныя абавязкі: а) устанаўленьне тэрміну ўносу па самаабкладаньні, а таксама тэрміну прыбыцьця грамадзян для працоўнага ўдзелу, у адпаведнасьці з пастановаю агульнага сходу аб самаабкладаньні; б) збор, захаваньне і падлік сродкаў і матар'ялаў, якія паступаюць у парадку самаабкладаньня; в) вядзеньне патрэбных закупак і заключэньне дагавору паводле пастановы агульнага сходу ў адпаведнасьці з дзеючымі законамі; г) кіраваньне ўсімі работамі, якія вядуцца ў парадку працоўнага ўдзелу, разьмеркаваньне паасобных абавязкаў паміж грамадзянамі, назначэньне кіраўнікоў работ, падлік зьяўленьня на працу і зробленай працы; д) распараджэньне ўсёю маемасьцю, якая набываецца за кошт самаабкладаньня, а таксама і грамадзкімі капіталамі, якія складаюцца ў парадку самаабкладаньня.

Увага. Калі самаабкладаньне ўстаноўлена для агульных патрэб некалькіх населішчаў, абʼяднаных рознымі сельскімі саветамі, то абавязкі, паказаныя ў гэтым артыкуле, усклядаюцца на райённы выканаўчы камітэт.

22. Сродкі, атрыманыя ў парадку самаабкладаньня, могуць выдавацца толькі на тыя мэты, якія вызначаны ў адпаведнай пастанове агульнага сходу грамадзян. За парушэньне гэтага правіла вінаватыя прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці.

23. Сельскі савет дае агульнаму сходу справаздачу аб выдаткаваньні сродкаў, атрыманых у парадку самаабкладаньня, а таксама аб вядзеньні работ у парадку працоўнага ўдзелу грамадзян.

24. Агульны нагляд за вядзеньнем самаабкладаньня ўскладзецца на акруговыя і райённыя выканаўчыя камітэты. На раёнскіх камісіі сельскіх саветаў ускладаецца абавязак раёнаваць усю дзейнасьць сельскіх саветаў на вядзеньні самаабкладаньня.

25. Агульны падлік разьмеру самаабкладаньня арганізуецца Народным Камісарыятам Фінансаў БССР пасьля ўзгадненьня з зацікаўленымі ведамствамі.

26. Самаабкладаньне насельніцтва на грамадзкія патрэбы ў іншых, непрадугледжаных арт. 1 гэтай пастановы, выпадках, дазваляецца толькі на асновах дабравольнай згоды грамадзян, паводле артыкулаў 27-29.

27. Пастановы аб дабравольным самаабкладаньні могуць прымацца на сельскіх сходах і іншых сходах грамадзян з дадзным вызначэньнем мэты, агульнага разьмеру і раскладкі самаабкладаньня паміж асобамі, галасаваўшымі за іх прыняцьце, а таксама парадку выдаткаваньня і кантролю за выдаткаваньнем сродкаў, што паступаюць на самаабкладаньні. Для асоб, якія ня бралі ўдзелу на сходах, а таксама для асоб, якія ўстрымаліся ад галасаваньня або галасавалі супроць прыняцьця пастановы, апошняя неабавязкова.

28. Усе спрэчкі, якія ўзьнікаюць па нытаньнях дабравольнага самаабкладаньня, могуць вырашацца толькі судом. Ужываньне ў такіх выпадках якіх-небудзь мер адміністрацыйнага ўпливу або прымусу не дапушчаецца. Удзел сельскіх саветаў і іншых адміністрацыйна-фінансавых органаў у вядзеньні самаабкладаньня і ў спагнаньні ўзносаў, што належаць з паасобных грамадзян, забараняецца.

29. Выдаткаваньне сабраных па дабравольным самаабкладаньні сродкаў не на мэты, для якіх збор быў зроблен, катэгорыцна забараняецца.

30. Гэтая пастанова не распаўсюджваецца на зборы, якія устанаўляюць для сваіх членаў арганізацыі, маючыя паводле сваіх статутаў або палажэньняў аб іх, а таксама для асоб, якія ня ўтрымаліся ад выдаткаваньня сродкі на права абкладаць сваіх членаў зборамі на задаваленьне тых ці іншых патрэб. Гэтыя зборы ўстанаўляюцца і атрыманыя сродкі выдаткоўваюцца ў парадку, прадугледжаным або ў спэцыяльным законе або ў статуце ці палажэньні аб данай арганізацыі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

14 студзеня 1928 г.
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

о самообложении населения.

Согласно постановления ЦИК і СНК Союза ССР „О самообложении населения" (С. З. СССР 1927 г., № 51, ст. 509) и согласно поручения 2-ой Сессии ЦИК БССР VIII созыва Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

1. Для удовлетворения местных хозяйственных, культурно-просветительных, санитарных нужд и нужд благоустройства сельского населения может устанавливаться обязательное для всех граждан данного селения самообложение в границах и порядке, предусмотренных настоящим постановлением:

а) на организацию, содержание и обслуживание (постройка новых, достройка неоконченных, расширение, наем, капитальный и текущий ремонт зданий, оборудование, отопление и освещение) хозяйственных, культурно-просветительных и санитарных учреждений местного общественного значения: школ, изб-читален, клубов, красных уголков, детских домов, ясель и площадок, больниц, врачебных, фельдшерских, ветеринарных и агрономических пунктов, домов для инвалидов и для престарелых, ночлежных домов, бань и хлебозапасных магазинов;

б) на благоустройство селений: рытье и содержание в исправности колодцев, общественных сажалок, площадей, могильников для павшаго скота, площадей общественного пользования (выгонов, лугов), а также на содержание ночных и полевых сторожей;

в) на проведение новых, содержание и ремонт существующих дорог, мостов, плотин, переправ и перевозов, имеющих местное общественное значение;

г) на противопожарные мероприятия: постройка, капитальный и текущий ремонт и хозяйственное содержание пожарных депо и сараев, на приобретение и содержание противопожарных машин и орудий, на содержание пожарных сторожей;

д) на содержание лесной стражи и на лесокультурные работы в лесах местного значения.

2. Запрещается самообложение на нужды административного характера (вознаграждение работников местных органов власти: районного исполнительного комитета, сельского совета, милиции, сельских исполнителей и др., содержание и оборудование для них помещений, а также расходы канцелярские, разъездные и др.).

3. Общий размер самообложения на один год не может превышать 35 проц. общей суммы сельско-хозяйственного налога по окладным листам за данный год со всего количества хозяйства данного селения.

4. Самообложение допускается как в денежной, так и в натуральной форме, а также в виде трудового участия.

5. Вопросы об установлении самообложения возбуждаются по инициативе сельского совета, отдельных граждан или групп граждан и общественных организаций и разрешаются на общем сходе граждан, созываемом сельским советом. Для установления самообложения необходимо присутствие на общем сходе не меньше половины общего числа граждан данного селения, пользующихся избирательными правами.

Примечание: Если на первом общем сходе граждан по вопросу о самообложении придет менее половины общего числа граждан, пользующихся избирательными правами, то созывается второй общий сход. Для разрешения вопросов о самообложении на другом сходе должно присутствовать не менее одной трети общего числа граждан, пользующихся избирательными правами.

6. Вопрос о введении самообложения и все другие вопросы на сходе о самообложении разрешаются простым большинством голосов граждан, пользующихся избирательными правами.

7. В случае необходимости удовлетворить общую нужду двух или нескольких селений, входящих в один сельский совет, вопрос о введении самообложения может разрешаться как на общих сходах каждого селения в отдельности, так и на об'единенном общем сходе граждан всех заинтересованных селений с тем, чтобы на этом об'единенном общем сходе присутствовало не меньше половины общего числа граждан, пользующихся избирательными правами, с каждого заинтересованного селения. Если удовлетворение данной общественной нужды касается нескольких поселений, об'единенных разными сельскими советами, то вопрос о введении самообложения передается на обсуждение общих сходов через соответствующий районный исполнительный комитет.

8. Общий сход граждан данного селения может освободить от самообложения отдельные наиболее маломощные хозяйства.

9. На общем сходе должны быть разрешены следующие вопросы:

а) метод самообложения; б) форма самообложения (денежная, натуральная или трудовая); в) общий размер самообложения г) предельный срок взносов по самообложению, при чем, если самообложение устанавливается в виде регулярных взносов, то в постановлении необходимо отметить срок, на который устанавливается самообложение, но каждый раз не свыше одного года. Все разрешенные вопросы должны быть записаны в постановлении, принятом общим сходом и подписанном президиумом схода.

10. Не позднее 3-х дней со дня получения постановления общего схода граждан селения о самообложении, сельский совет с участием представителя крестьянского комитета взаимопомощи делает раскладку общей суммы самообложения между отдельными хозяйствами и гражданами данного селения, причем сохраняются следующие правила: раскладка производится пропорционально сумме сельско-хозяйственного, промыслового и подоходного налогов, уплачиваемых данным хозяйством или лицом в течение года. Хозяйства, освобожденные от сельско хозяйственного налога, облагаются пропорционально начисленных на них сумм сельско-хозяйственного налога. Кустари, освобожденные от налога, облагаются в размере средней ставки сельского хозяйства, освобожденных от сельско-хозяйственного налога.

Примечание. Граждане, находящиеся на государственной службе и не ведущие самостоятельно сельского хозяйства, не привлекаются к самообложению в тех случаях, когда они не получают непосредственной выгоды от мероприятий, на которые производится самообложение.

11. Сельский совет имеет право по ходатайству отдельных хозяйств или лиц, разрешить замену установленной общим сходом формой самообложения другой формой, например, вместо денежной натуральные взносы или трудовое участие. При такой замене сельский совет должен главным образом учесть интересы маломощных групп сельского населения.

12. Раскладка самообложения не позднее одной недели со дня утверждения ее сельским советом об'является населению через сельских исполнителей под росписку.

13. В течение двух недель со дня об'явления раскладки заинтересованные граждане имеют право подать в сельский совет жалобу на постановление о самообложении как в целом, так и в части раскладки.

14. По окончании срока, указанного в предыдущей статье, сельский совет направляет в районный исполнительный комитет постановление общего собрания граждан о самообложении со своим заключением, раскладку его и все поступившие жалобы.

15. Райённый исполнительный комитет может отменить постановление схода граждан о самообложении в следующих случаях: а) если общий сход граждан, принявший постановление о самообложении, не имел законной силы, или если были допущены существенные нарушения настоящего постановления, б) если мероприятия, для осуществления коих установлено самообложение, не предусмотрены в этом постановлении, в) если превышен установленный для данного селения предельный размер самообложения.

16. В случаях неправильности произведенной раскладки, районный исполнительный комитет обязан, независимо от того, обжалована ли раскладка или нет, произвести в них необходимые изменения.

17. Если в течение двух недель со дня представления сельским советам в райённый исполнительный комитет постановления общего схода граждан о самообложении оно не будет отменено райённым исполнительным комитетом, а равно, если районный исполнительный комитет не внесет изменений в раскладку, представленную сельским советом, то постановление о самообложении и раскладка считаются утвержденными и являются обязательными для всех граждан данного селения.

18. Райённый исполнительный комитет, отказавши в удовлетворении жалобы, обязан известить лицо, подавшее жалобу, об основаниях отказа.

На указанные постановления могут быть поданы жалобы в окружный исполнительный комитет, постановления коего являются окончательными.

Подача жалобы на постановления районного исполнительного комитета не приостанавливает исполнение постановления о самообложении.

19. В случае, когда постановление об удовлетворении жалобы состоялось после того, как раскладка вошла в силу, сумма, внесенная лицом, подавшим жалобу, или взысканное с него, подлежит зачету при проведении нового самообложения в данном селении, или возврату.

20. Недоимки по самообложению взыскиваются сельским советом в административном порядке, установленном для взыскания налогов.

Примечание. В случае неисполнения населением в установленный срок самообложения вместо трудового участия, стоимость таких работ переводится сельским советом особым его постановлением на деньги и взыскивается в порядке, указанном в настоящей статье.

21. На сельский совет возлагаются следующие обязанности по осуществлению самообложения: а) установление срока взноса по самообложению, а также сроков явки граждан для трудового участия, в соответствии с постановлением общего схода граждан о самообложении, б) сбор хранения и учет средств и материалов, поступающих в порядке самообложения, в) производство необходимых закупок и заключение договоров, согласно постановлению общего схода в соответствии с действующими законами, г) руководство всеми работами, проводимыми в порядке трудового участия, распределение между гражданами отдельных обязанностей, назначение руководителей работ, учет явки на работу и произведенной работы; д) распоряжение всем имуществом, приобретенным за счет самообложения, а также общественными капиталами, образуемыми в порядке самообложения.

Примечание. В случае, когда самообложение установлено для удовлетворения общих потребностей нескольких селений, об'единенных различными сельскими советами, указанные в настоящей статье обязанности возлагаются на районный исполнительный комитет.

22. Средства, полученные в порядке самообложения, могут расходоваться только на те цели, которые указаны в соответствующем постановлении общего схода граждан. За нарушение этого правила виновные привлекаются к уголовной ответственности.

23. Сельский совет дает общему собранию отчет о расходовании средств, полученных в порядке самообложения, а также о проведении работ в порядке трудового участия граждан.

24. Общее наблюдение за проведением самообложения возлагается на окружные и районные исполнительные комитеты. На ревизионные комиссии сельских советов возлагается обязанность производить ревизии всей деятельности сельских советов по проведению самообложения.

25. Общий учет размеров самообложения организуется Народным Комиссариатом Финансов БССР по соглашению с заинтересованными ведомствами.

26. Самообложение населения на общественные нужды в прочих, не предусмотренных статьей 1 настоящего постановления, случаях, допускается лишь на началах добровольного соглашения граждан, в порядке ст. ст. 27-29.

27. Постановления о производстве добровольного самообложения могут приниматься на сельских сходах и иных собраниях граждан с точным указанием целей, общего размера и раскладки самообложения между лицами, голосовавшими за принятие, а также порядка расходования и контроля за расходованием средств, поступающих по самообложению. Для лиц, не принимавших участия в собрании, а также для лиц, воздержавшихся от голосования или голосовавших против принятия постановления, последнее не обязательно.

28. Все возникающие по вопросам добровольного самообложения споры могут быть разрешаемы только в судебном порядке. Применение в этих случаях каких либо мер административного воздействия или понуждения не допускается. Участие сельских советов и других административных и финансовых органов в проведении самообложения и производстве взыскания взносов, причитающихся с отдельных граждан, воспрещается.

29. Расходование собранных по добровольному самообложению средств не на те цели, для которых сбор был произведен, преследуется в уголовном порядке.

30. Настоящее постановление не распространяется также на сборы, устанавливаемые для своих членов организациями, имеющими по своим уставам или положениям о них право облагать своих членов сборами на удовлетворение тех или иных нужд. Такие сборы устанавливаются и собранные средства расходуются в порядке, предусмотренном специальным законом, или уставом или положением о данной организации.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

14 января 1928 года.
г. Минск.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКАЎ! Кантора газэты „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ" просіць менскіх падпісчыкаў, якім належыць атрымаць кніжкі касы ашчадкасьці, з зьвяцца для атрыманьня іх у кантору газэты. — ПРЭМІЮ.

20 СТУДЗЕНЯ 1928 г. А 12 ГАДЗ. ДНЮ Ў ПАМЯШК. МЕНКАМГАСУ (ПЛЯЦ ВОЛІ, № 2)

адбудуцца вусныя ТАРГІ

на прадажу домаўладаньняў і на здачу ў арэнду драўляных складаў.

ДРАВЯНЫЯ СКЛАДЫ:

На вул. Савецкай № 6 — —